ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЇН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 4 (599) | Субота, 25 студзеня 1947 года. | Цана 50 кап.

Часопіс „Лук“ апублікаваў інтэрв'ю таварыша Сталіна з Эліотам Рузвельтам

НЬЮ-ІОРК, 20 студзеня (ТАСС). Часопіс «Лук» апублікаваў артыкул Эліота Рузвельта, у якім ёсць інтэрв'ю з таварышам Сталіным, дадзенае 21 снежня 1946 года. У артыкуле падаюцца адказы І. В. Сталіна на 12 пытанняў, якія задаў яму Рузвельт. Падаем тэкст пытанняў Рузвельта і адказаў І. В. Сталіна:

1. Пытанне: Ці лічыце Вы мажлівым для такой дэмакратыі, як Злучаныя Штаты, міралюбіва жыць побач у гэтым свеце з такой комуністычнай формай дзяржаўнага кіравання, якая існуе ў Совецкім Саюзе, і што ні з таго ні з другога боку не будзе ўжывацца спроба ўмешвацца ва ўнутрыпалітычныя справы другога боку?

Адказ: Так, вядома. Гэта не толькі магчыма. Гэта разумна і можа быць цалкам здзейснена. У самыя напружаныя часы ў перыяд вайны розніца ў форме кіравання не перашкодзіла нашым двум краінам аб'яднацца і перамагчы нашых ворагаў. Яшчэ ў большай ступені магчыма захаванне гэтых адносін у мірны час.

2. Пытанне: Ці лічыце Вы, што поспех Аб'яднаных Нацый залежыць ад згоды па карэнных пытаннях палітыкі і мэтах паміж Совецкім Саюзам, Англіяй і Злучанымі Штатамі?

Адказ: Так, я так думаю. У многіх адносінах лёс Аб'яднаных Нацый, як арганізацыі, залежыць ад дасягнення гармоніі паміж гэтымі трыма дзяржавамі.

3. Пытанне: Ці лічыце Вы, Генералісімус, што важным крокам на шляху да ўсеагульнага міру з'явілася-б дасягненне шырокага эканамічнага пагаднення аб узаемным абмене прамысловымі вырабамі і сыравінай паміж нашымі двума краінамі?

Адказ: Так, я лічу, што гэта з'явілася-б важным крокам на шляху да ўстанаўлення ўсеагульнага міру. Вядома, я згодзен з гэтым. Пашырэнне міжнароднага гандлю ў многіх адносінах садзейнічала-б развіццю добрых адносін паміж нашымі двума краінамі.

4. Пытанне: Ці выказваецца Совецкі Саюз за неадкладнае стварэнне Советам Бяспекі Аб'яднаных Нацый міжнародных паліцэйскіх сіл з удзелам узброеных сіл усіх Аб'яднаных Нацый, якія неадкладна выступілі-б усюды, дзе свету пагражалі-б ваенныя дзеянні?

Адказ: Вядома.

5. Пытанне: Калі Вы лічыце, што Аб'яднаныя Нацыі павінны кантраляваць атамную бомбу, дык ці не павінны яны гэта рабіць шляхам інспекцыі, устанаўлення кантроля над усімі даследчымі інстытутамі і прамысловымі прадпрыемствамі, якія вытвараюць узбраенне ўсіх родаў, і мірным скарыстаннем і развіццём атамнай энергіі. (У гэтым месцы Эліот Рузвельт у дужках указвае: «Сталін неадкладна задаў мне пытанне: «Наогул?» Я сказаў: «Так, але, у прыватнасці, ці згодна Расія ў прынцыпе з такім планам»).

Адказ: Вядома. На аснове прынцыпа роўнасці для Расіі не павінны рабіцца ніякія выключэнні. Расія павінна падпарадкавацца тым-жа правілам інспекцыі і кантроля, як і любыя другія краіны. (У гэтым месцы Рузвельт у дужках указвае: «У яго адказе не было ніякага хістання. І пытанне аб рэзервацыі права вета не было нават успамянута»).

6. Пытанне: Ці лічыце Вы карысным скліканне новай нарады вялікай тройкі для абмеркавання ўсіх міжнародных праблем, якія пагражаюць у сучасны момант усеагульнаму міру?

Адказ: Я лічу, што павінна адбыцца не адна нарада, а некалькі нарад. Калі-б адбылося некалькі нарад, яны паслужылі-б вельмі карыснай мэце. (У гэтым месцы Рузвельт у дужках указвае: «У гэты момант мая жонка запыталася, ці думае ён, што такія нарады садзейнічалі-б устанаўленню больш шчыльных адносін на ніжэйстаячых ступенях паміж прадстаўнікамі адпаведных урадаў. Яна запыталася таксама, ці было дасягнута такое становішча ў выніку канферэнцыі ваеннага часу. Сталін адказаў, усміхнуўшыся да яе: «У гэтым няма ніякага сумнення. Нарады ваеннага часу і дасягнутыя вынікі значна дапамаглі ўстанаўленню супрацоўніцтва на ніжэйстаячых ступенях»).

7. Пытанне: Сэр, я ведаю, што Вы вывучаеце многія палітычныя і социяльныя праблемы, якія існуюць у другіх краінах. Таму мне хацелася-б запытаць Вас, ці лічыце Вы, што выбары, якія адбываліся ў Злучаных Штатах у лістападзе, сведчаць аб адыходзе народа ад веры ў палітыку Рузвельта, у бок ізаляцыяніскай палітыкі яго палітычных праціўнікаў?

Адказ: Я не настолькі знаёмы з унутраным жыццём народа Злучаных Штатаў, але, мне здаецца, што выбары сведчаць аб тым, што цяперашні ўрад траціць маральны і палітычны капітал, створаны нябожчыкам прэзідэнтам, і, такім чынам, ён зрабіў больш лёгкай перамогу рэспубліканцаў. (У гэтым месцы Рузвельт у дужках адзначае: «На наступнае маё пытанне Генералісімус адказаў вельмі падкрэслена»).

8. Пытанне: Чым Вы тлумачыце паслабленне сяброўскіх сувязей і ўзаемаразумення паміж нашымі двума краінамі з часу смерці Рузвельта?

Адказ: Я лічу, што, калі гэта пытанне адносіцца да сувязей і ўзаемаразуменняў паміж амерыканскім і рускім народамі, дык ніякага пагоршання не адбылося, а, наадварот, адносіны палепшыліся. Што датычыць адносін паміж двума ўрадамі, дык узнікалі непаразуменні. Адбылося некаторае пагоршанне, а затым узняўся вялікі шум і пачалі крычаць пра тое, што ў далейшым адносіны яшчэ больш пагоршацца, але я не бачу тут нічога страшнага ў сэнсе парушэння міру ці ваеннага канфлікта. Ні адна вялікая дзяржава, нават калі яе ўрад і імкнецца да гэтага, не змагла-б у цяперашні час выставіць вялікую армію для барацьбы супроць другой саюзнай дзяржавы, другой вялікай дзяржавы, бо ў цяперашні час ніхто не можа ваяваць без свайго народа, а народ не хоча ваяваць. Народы стаміліся ад вайны. Акрамя таго, няма ніякіх зразумелых мэт, якія-б апраўдалі новую вайну. Ніхто не ведаў-бы, за што ён павінен змагацца, і таму я не бачу нічога страшнага ў тым, што некаторыя прадстаўнікі ўрада Злучаных Штатаў кажуць аб пагоршанні адносін паміж намі. У святле ўсіх гэтых меркаванняў я лічу, што пагроза новай вайны нерэальна.

9. Пытанне: Ці выказваецеся Вы за шырокі абмен інфармацыяй культурнага і навуковага характару паміж нашымі двума краінамі. Ці выказваецеся Вы таксама за абмен студэнтамі, артыстамі, вучонымі, прафесарамі?

Адказ: Вядома.

10. Пытанне: Ці павінны Злучаныя Штаты і Совецкі Саюз распрацаваць агульную, разлічаную на доўгі тэрмін палітыку дапамогі народам Далёкага Ўсходу?

Адказ: Я лічу, што гэта было-б карысна, калі-б гэта было мажліва. Ва ўсякім разе, наш урад гатовы праводзіць агульную з Злучанымі Штатамі палітыку па далёкаўсходніх пытаннях.

11. Пытанне: Калі паміж Злучанымі Штатамі і Совецкім Саюзам будзе дасягнута пагадненне аб сістэме пазык або крэдытаў, ці прынясуць такія пагадненні доўгатрывалыя выгоды эканоміцы Злучаных Штатаў?

Адказ: Сістэма такіх крэдытаў, бясспрэчна, узаемна выгодна як Злучаным Штатам, так і Совецкаму Саюзу. (У гэтым месцы Рузвельт у дужках адзначае: «Затым я задаў пытанне, якое выклікае выразны непакой у многіх краінах Еўропы»).

12. Пытанне: Ці дае сур'ёзныя падставы для непакою совецкага ўрада той факт, што ў амерыканскай і англійскай зонах акупацыі Германіі не была праведзена праграма дэнацыфікацыі?

Адказ: Не, гэта не з'яўляецца падставай для сур'ёзнага непакою, але, вядома, Совецкаму Саюзу непрыемна, што гэтая частка нашай агульнай праграмы не ажыццяўляецца.

Урачыста-жалобнае паседжанне, прысвечанае XXIII гадавіне з дня смерці В. І. Леніна

21 студзеня ў Маскве ў Дзяржаўным Акадэмічным ордэна Леніна Вялікім тэатры Саюза ССР адбылося ўрачыста-жалобнае паседжанне ЦК ВКП(б), МК і МГК ВКП(б), Прэзідыумаў Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета РСФСР, Маскоўскага абласнога і гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, ЦК ВЛКСМ, МК і МГК ВЛКСМ, Прэзідыума ВЦСПС сумесна з прадстаўнікамі партыйных, грамадскіх арганізацый і Совецкай Арміі.

Прадстаўнікі працоўных сталіцы сабраліся на ўрачыста-жалобнае паседжанне, каб ушанаваць памяць Леніна, з імем якога звязана барацьба за знішчэнне ўлады буржуазіі, перамога Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, першыя гады будаўніцтва і ўмацавання Совецкай дзяржавы.

... У глыбіні сцэны ўзвышаецца вялікі партрэт Владзіміра Ільіча, акаймаваны сцягамі і жывымі кветкамі. У маўчанні застыла ганаровая варта. Над сцэнай — транспарант, на якім зззяюць словы: «Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Леніна — Сталіна».

З дня смерці Леніна мінула 23 гады. Совецкі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна ажыццявіў вялікую ленінскую праграму социялістычнай перабудовы краіны. Годы сталінскіх пяцігодак, годы социялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі змянілі воблік нашай Радзімы. Совецкая краіна стала магутнай социялістычнай дзяржавай.

Бессмяротная справа Леніна жыве ў нашых вялікіх перамогах — ваенных і працоўных, у нашай стваральнай працы, у барацьбе за перамогу комунізма ў нашай краіне.

18 гадзін 50 хвілін...

У прэзідыуме ўрачыста-жалобнага паседжання з'яўляюцца таварыш І. В. Сталін, т. т. В. М. Молатаў, Л. П. Берыя, К. Я. Варашылаў, Г. М. Малянкоў, А. І. Мікаян, А. А. Андрэеў, Л. М. Каганові́ч, Н. М. Швернік, Н. А. Вазнясенскі, Н. А. Булганін, А. Н. Касыгін, А. А. Кузняцоў, Н. С. Патолічаў, Г. М. Папоў, М. Ф. Шкіратаў.

Удзельнікі паседжання ўстаюць і бурнай авацыяй вітаюць таварыша І. В. Сталіна і яго верных паплечнікаў, кіраўнікоў партыі і ўрада.

Старшыня тав. Швернік абвяшчае ўрачыста-жалобнае паседжанне адкрытым.

Прамова тав. Шверніка.

— Таварышы! Урачыста-жалобнае паседжанне Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), Маскоўскага абласнога і гарадскога камітэтаў ВКП(б), Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР, Маскоўскага абласнога і гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ, Маскоўскага абласнога і гарадскога камітэта ВЛКСМ, Прэзідыума ВЦСПС сумесна з прадстаўнікамі партыйных, грамадскіх арганізацый і Совецкай Арміі, прысвечанае XXIII гадавіне з дня смерці Владзіміра Ільіча Леніна, абвяшчаю адкрытым.

23 гады назад, 21 студзеня ў 6 гадзін 50 хвілін перастала біцца сэрца заснавальніка і правадыра вялікай партыі большэвікоў, арганізатара першай у свеце социялістычнай дзяржавы — Владзіміра Ільіча Леніна. Прашу ўшанаваць памяць Владзіміра Ільіча Леніна ўставаннем.

У глыбокім маўчанні ўсе ўстаюць.

Старшыня прадастаўляе слова для даклада тав. Г. Ф. Аляксандраву.

Дакладчык гаворыць аб гераічным шляху совецкага народа, які ідзе па слядах вялікага Леніна. Партыя большэвікоў, якая смела і ўпэўнена ўзялася за ажыццяўленне ленінскага плана будаўніцтва социялізма, здабыла пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна сусветна-гістарычныя поспехі. Разбіўшы ворагаў народа — контрэволюцыйных троцкістаў усялякага роду, бухарынцаў і іншых здраднікаў і капітулянтаў, партыя ўзняла ўвесь совецкі народ на барацьбу за социялізм. Совецкі народ выканаў галоўны запавет Леніна: пабудаваў у нашай краіне социялістычнае грамадства — першую ступень комунізма.

Пры ўпамінанні імя таварыша Сталіна — геніяльнага прадаўжальніка справы Леніна — усе ўдзельнікі схода наладжваюць бурную працяглую авацыю.

Партыя выканала запавешчаную Леніным задачу ўмацавання саюза рабочага класа і сялянства, свабоднага развіцця і супрацоўніцтва ўсіх нацый і народаў у Совецкай дзяржаве, умацавання дружбы народаў Совецкага Саюза.

— Вайна паказала, — заяўляе тав. Аляксандраў, — што няма цяпер такой сілы, якая магла-б пераўзысці магутнасць совецкага грамадства. Гэту заяву зал сустракае працяглымі апладысментамі. Дакладчык указвае, што эканамічная база, створаная за гады пяцігодак, дала нашаму народу магчымасць узяцца ўжо ў ходзе вайны і яшчэ больш грунтоўна адразу-ж пасля яе заканчэння за хуткае аднаўленне гаспадаркі і далейшае мірнае будаўніцтва.

Першы год новай, пасляваеннай пяцігодкі, якую ажыццяўляе совецкі народ, вызначыўся значнымі дасягненнямі ў галіне народнай гаспадаркі.

— Наша краіна, — прадаўжае тав. Аляксандраў, — зноў разгортвае цяпер свае магутныя сілы на фронце мірнай працы. Цяжкая вайна засталася ззаду. Але таму наша партыя і называецца ленінскай, што і пасля вялікай перамогі над ворагам, яна вучыць народ не адпачываць на лаўрах, а быць пільным і насцярожаным.

— Сіла нашай партыі, сіла совецкіх людзей заключаецца ў тым, што яны змагаюцца, працуюць і будуюць сваё жыццё па Ільічу, — гаворыць тав. Аляксандраў.

У заключэнне свайго даклада тав. Аляксандраў гаворыць аб ленінскай партыі—кіруючай і накіроўваючай сіле совецкага грамадства.

Заключнае слова дакладчыка, прысвечанае партыі Леніна — Сталіна, вялікаму прадаўжальніку справы Леніна таварышу Сталіну, сход сустракае бурнымі, доўга не змаўкальнымі апладысментамі. Усе ўдзельнікі паседжання ўстаюць, горача вітаюць таварыша Сталіна. Прысутныя выконваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал».

* * *

Пасля заканчэння ўрачыста-жалобнага паседжання адбыўся праглядзе дакументальнага фільма з жыцця В. І. Леніна кіно-карціны «Ленін у Кастрычніку» і канцэрт з удзелам майстроў мастацтва сталіцы.

(ТАСС).

Урачыста-жалобнае паседжанне, прысвечанае XXIII гадавіне з дня смерці В. І. Леніна ў г. Мінску

21 студзеня ў памяшканні Акруговага Дома афіцэраў адбылося ўрачыста-жалобнае паседжанне Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных сумесна з партыйнымі, грамадскімі арганізацыямі і прадстаўнікамі вайсковых часцей, прысвечанае XXIII гадавіне з дня смерці Владзіміра Ільіча Леніна. На паседжанні прысутнічалі сотні лепшых людзей сталіцы рэспублікі — стаханаўцы прадпрыемстваў, дзеячы навукі, мастацтва, служачыя ўстаноў, салдаты і афіцэры Совецкай Арміі.

За сталом прэзідыума — таварышы Кісялёў, Малін, Бугаеў, Казлоў, Шаўроў, Ільюшын, Лахтанаў, Эйдзінаў, Крупеня, Забела, Крылоў, Мазураў, Длугашэўскі, Зімянін, Золаў, Бударын, Іваноў, Казбінцаў, Бельскі і другія.

Урачыста-жалобнае паседжанне адкрыў старшыня выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных тав. Длугашэўскі.

Пад бурныя, доўга не змаўкальныя апладысменты у ганаровы прэзідыум выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З дакладам «XXIII гады без Леніна, па ленінскаму шляху, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна» выступіў сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе тав. Бугаеў.

Удзельнікі ўрачыста-жалобнага паседжання з вялікім натхненнем прынялі тэкст прывітальнага ліста вялікаму прадаўжальніку справы і вучэння Леніна — таварышу Сталіну.

У канцы ўрачыста-жалобнага паседжання быў выкананы партыйны гімн «Інтэрнацыянал». (БЕЛТА).

АГІТАЦЫЯ ЗА КАНДЫДАТАЎ СТАЛІНСКАГА БЛОКА

Выбарчая кампанія ўступіла ў самы адказны перыяд. Ужо зарэгістраваны кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета ўсіх саюзных і аўтаномных рэспублік і пачалася агітацыя за іх.

Вялікую работу ў справе агітацыі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных могуць і павінны выканаць работнікі літаратуры і мастацтва. У іх ёсць ужо вопыт удзелу ў папярэдніх перадвыбарных кампаніях. Нашы пісьменнікі і паэты павінны раскрыць у мастацкіх творах сутнасць совецкай дэмакратыі, якая жыццядзейна ўплывае на адбудову і росквіт совецкай Радзімы. І тут перад совецкімі літаратарамі безліч захапляючых тэм. На прыкладзе росквіту пры совецкай уладзе беларускага народа, які ў дарэволюцыйныя часы быў адным з самых загнаных народаў Расіі, можна паказаць веліч ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Вялікі Сталін—адзінадушна і ад усяго сэрца выдучаны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўных Советаў усіх саюзных і аўтаномных рэспублік Совецкага Саюза. Гэта ёсць выяўленне бязмежнай любві і даверу народаў нашай неабсяжнай Радзімы да таго чалавека, які вёў іх ад перамогі да перамогі ў мірны час, які з чэсцю правёў іх праз усе выпрабаванні Айчыннай вайны.

Таварыш Сталін, яго велічны вобраз—цудоўная і натхнёная тэма нашай літаратуры і мастацтва. Паказаць усенародную любоў совецкіх людзей да свайго правадыра, — пачэсны абавязак дзеячоў нашай літаратуры і мастацтва.

Побач з таварышам Сталіным у Вярхоўныя Советы многіх рэспублік, у тым ліку і Беларускай ССР балатыруюцца яго бліжэйшыя і верныя памочнікі—таварышы Молатаў, Варашылаў, Жданаў, Кагановіч, Андрэеў, Мікаян, Кузняцоў, Патолічаў. Гэта лепшыя з лепшых прадстаўнікоў партыі Леніна—Сталіна, непахісныя змагары за справу комунізма. Іх воблік павінен ва ўсёй велічы паўстаць перад нашымі выбаршчыкамі.

Адданых сваіх сыноў пасылае наша Радзіма ў Вярхоўны Совет БССР. Тут і выдатныя дзяржаўныя і партыйныя дзеячы, як Старшыня Совета Міністраў БССР і Сакратар ЦК КП(б)Б тав. П. К. Панамарэнка, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. Я. Наталевіч, рабочыя-стаханаўцы, калгаснікі, інтэлігенты. У Вярхоўны Совет БССР вылучаны канструктар беларускага аўтамабіля Кокін, рабочы завода імя Кірава Цханаў, старшыня калгаса Ф. Трушкевіч, настаўніца Захарэвіч і многія іншыя. Іх жыццёвы шлях варты ўвасаблення ў мастацкім слове.

Нарэшце, сярод кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР вялікую групу складаюць дзеячы літаратуры і мастацтва: Якуб Колас, М. Лынькоў, К. Крапіва, З. Азгур, А. Куляшоў, П. Броўка, М. Танк, І. Ждановіч, П. Лютаровіч, І. Ахрэмчык, М. Садковіч, М. Асмалоўскі, А. Багатыроў, М. Керэін, І. Балоцін. Яны самі выйшлі з гушчы народа і сталі выдатнымі дзеячамі нашай социялістычнай культуры. Пра іх слаўныя творчыя перамогі павінны ведаць іх выбаршчыкі, якія аказалі ім высокі давер.

Беларускія пісьменнікі, артысты, мастакі, кампазітары нямала зрабілі ўжо для папулярызацыі жыццёвага шляху кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Пісьменнікамі напісаны дзесяткі нарысаў, мастакамі афармлены многія выбарчыя ўчасткі, кампазітары пішуць песні пра дзень усенароднага свята, артысты выступаюць са спецыяльнымі праграмамі. Аднак, трэба зрабіць яшчэ больш. Голас пісьменнікаў перад выбарамі павінен прагучаць не толькі ў сталіцы—Мінску, але і ў другіх гарадах, вёсках нашай рэспублікі. Мала яшчэ змястоўных плакатаў, лозунгаў, малюнкаў, якія-б папулярызавалі дасягненні нашай Радзімы, сустракаем мы ў гарадах, мястэчках і вёсках. Вялікую работу павінен тут разгарнуць Саюз мастакоў БССР.

Нярэдка нашы акторы абмяжоўваюць свой удзел у перадвыбарнай кампаніі выступленнямі перад выбаршчыкамі з урыўкамі з п'ес, якія ідуць у тэатрах, або даўно падрыхтаванымі нумарамі. А між іншым, у мінулыя перадвыбарныя кампаніі была добрая практыка—падрыхтоўваць спецыяльныя праграмы. З гэтым трэба паспяшацца, бо часу засталося няшмат.

Нарэшце, таварышы пісьменнікі, акторы, мастакі, кампазітары, якія працуюць непасрэдна сярод выбаршчыкаў агітатарамі, павінны ўзмацніць сваю работу. Перад імі цудоўная мажлівасць бліжэй пазнаёміцца з рознастайнымі пластамі совецкіх людзей, пакінуць у іх сэрцы запамінальны след. Хто лепш і больш ярка, як работнік мастацтва і літаратуры, здолее расказаць ім пра велічныя перспектывы нашай Радзімы ў чацвертай сталінскай пяцігодцы!

Работнікі літаратуры і мастацтва Беларусі павінны быць у першых радах нястомных прапагандыстаў дасягненняў нашай социялістычнай дзяржавы, нястомных агітатараў за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных!

Ад Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Міністраў СССР

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і Совет Міністраў Саюза ССР з глыбокім жалем паведамляюць, што 21 студзеня 1947 года ў Маскве пасля працяглай хваробы памерла Разалія Самойлаўна ЗЕМЛЯЧКА — старэйшы дзеяч большэвіцкай партыі, член Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), намеснік Старшыні Камісіі партыйнага кантролю, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВКП(б) СОВЕТ МІНІСТРАЎ СССР.

Беларускія мастакі да выстаўкі 30-годдзя совецкай улады

18 студзеня сход беларускіх мастакоў праслухаў даклад старшыні мастацкага совета Я. Зайцава аб падрыхтоўцы да Усесаюзнай выстаўкі, прысвечанай 30-годдзю совецкай улады.

Мастакі Беларусі выконваюць работы на гістарычныя тэмы, гераіка-сімвалічныя і жанрава-бытавыя, а таксама пішуць пейзажы і партрэты. Заслужаны дзеяч мастацтва БССР І. Ахрэмчык працуе над карцінай на тэму «Беларускія партызаны на прыёме ў таварыша Сталіна», заслужаны дзеяч мастацтва БССР Я. Зайцаў піша карціну «Партызанскі парад», мастак К. Касмачоў—«Ленін у Разліве», мастак І. Давідовіч—«У Леніна ў Горках», мастак А. Гугель—«На магіле чырвонага воіна».

Жанрава-бытавыя тэмы распрацоўваюць мастакі П. Гаўрыленка — «З зямлянкі—у новы дом», Я. Красоўскі — «Даярка», Я. Шыбнёў — «Пасля аперацыі», Л. Лейтман — «Народнае гуляння ў парку культуры і адпачынку імя Горкага».

Заслужаны дзеяч мастацтва БССР У. Кудрэвіч выконвае пейзаж «На Дняпры». Мастак Забораў працуе над партрэтам «Маркс і Энгельс». В. Волкаў піша партрэты лепшых беларускіх студэнтаў.

Народны мастак БССР, лаўрэат Сталінскай прэміі З. Азгур выконвае партрэты герояў і знатных людзей Беларусі. Заслужаны дзеяч мастацтва БССР А. Бембель працуе над скульптурнай групай «За совецкую Радзіму».

Я. Зайцаў падкрэсліў, што, не гледзячы на ўсе цяжкасці, мастакі Беларусі павінны вырашыць пачэсную задачу стварэння глыбока-ідэйных і высомастацкіх твораў да юбілейнай выстаўкі.

У спрэчках прынялі ўдзел мастакі М. Тарасікаў, Я. Красоўскі, Л. Лейтман, Шэўчэнка, З. Паўлоўскі, П. Гаўрыленка, Б. Малкін, У. Кудрэвіч, К. Касмачоў, А. Шыбнёў, Л. Ран.

У заключэнне выступіў старшыня Саюза совецкіх мастакоў БССР І. Ахрэмчык.

НАС НАТХНЯЕ ВЯЛІКІ СЦЯГ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Даклад тав. Г. Ф. Аляксандрава 21 студзеня 1947 года на ўрачыста-жалобным паседжанні, прысвечаным XXIII-й гадавіне з дня смерці В. І. Леніна

Таварышы! Мінула дваццаць тры гады з таго дня, як памёр Уладзімір Ільіч Ленін. У гэтым, 1947 годзе спаўняецца трыццаць гадоў заснаванай вялікім Леніным Совецкай рэспублікі. Менш чым сем гадоў з іх змог кіраваць Ленін Совецкай дзяржавай. Пасля смерці Леніна наша партыя вось ужо дваццаць тры гады змагаецца за ажыццяўленне запаветаў Леніна, мацуе і ўзвялічвае нашу Совецкую дзяржаву, будуе і вядзе наперад па ленінскаму шляху наша совецкае грамадства. Шмат падзей адбылося за гэтыя напружаныя гады. Нямала суровых выпрабаванняў выпала на долю рэспублікі Саветаў. Вялікія справы, якія ў корані змянілі аблічча нашай краіны, былі здзейснены совецкім народам за гэты кароткі тэрмін. Цвёрда трымалі курс на перамогу сацыялізма, змагаліся за ўсталяванне і росквіт совецкага ладу наша партыя, яе ленінскі Цэнтральны Камітэт, яе правадыр таварыш Сталін (бурныя, працяглыя апладысменты). Партыя большэвікоў горда несла ўсе гэтыя гады свой ленінскі сцяг усё наперад і наперад, памнажаючы яго славу. Совецкі карабель з сваім выпрабаваным стырнавым упэўнена ішоў усе гэтыя гады праз буры і навальніцы да вялікай мэты — комунізма.

I

Совецкі народ ідзе па слядах вялікага Леніна

Пад кіраўніцтвам Леніна, заснавальніка Совецкай дзяржавы, пачалося будаўніцтва сацыялістычнага грамадства ў нашай краіне. Ленін вучыў, што ў Совецкай Расіі ёсць «... усё неабходнае для пабудовы поўнага сацыялістычнага грамадства». (Творы, т. XXVII, стар. 392).

Партыя большэвікоў смела і ўпэўнена ўзялася за ажыццяўленне ленінскага плана будаўніцтва сацыялізма і здабыла сусветна-гістарычныя поспехі. Згуртаваўшы вокруг сябе рады вакол таварыша Сталіна, партыя разбіла ворагаў народа, усялякіх контрэволюцыйных трацкістаў, бухарынцаў і іншых здраднікаў і капітулянтаў, і ўзняла ўвесь совецкі народ на барацьбу за сацыялізм. Совецкі народ, пераадольваючы пад кіраўніцтвам большэвікоў усе цяжкасці і выпрабаванні, выканаў галоўны запавет Леніна: пабудаваў у нашай краіне сацыялістычнае грамадства — першую ступень комунізма.

У краіне была створана буйная, сучасная сацыялістычная прамысловасць. Совецкае сялянства, аб'яднаўшыся ў калгасы, беспаваротна стала на шлях сацыялізма. Эксплаататарскія класы былі поўнасцю ліквідаваны. Партыя з поспехам выканала задачу, якую пакінуў у запавет Ленін, задачу ўмацавання саюза рабочага класа і сялянства, свабоднага развіцця і супрацоўніцтва ўсіх нацый і народаў у Совецкай дзяржаве — умацавання дружбы народаў Совецкага Саюза. Напярэдадні вайны кожны працоўны ўжо выразна адчуваў вынікі сваёй працы па будаўніцтву новых, сацыялістычных парадкаў. Надыходзіла пара дастатку, заможнага жыцця рабочых і сялян, народ атрымаў магчымасць карыстацца вынікамі сацыялістычнай культуры. Каб не была вайна, навязаная нам фашысцкімі выродкамі, совецкая краіна дасягнула-б за гэтыя гады новага магутнага росквіту, а совецкія людзі ў поўнай меры скарысталі-б матэрыяльныя і культурныя здабыткі сацыялізма.

Пераўтварэнне ў жыццё ленінскага плана будаўніцтва сацыялізма, ажыццяўленне трох перадвоенных пяцігодак зрабілі нашу краіну магутнай дзяржавай. «Гэта быў скачок, — сказаў таварыш Сталін, — пры дапамозе якога наша Радзіма ператварылася з адсталай краіны ў перадавую, з аграрнай — у індустрыяльную». Тым самым была створана эканамічная база, якая дала магчымасць арганізаваць разгром ворага ў Айчыннай вайне. Абапіраючыся на гэтую базу, совецкі народ і яго ўзброеныя сілы, кіруемыя комуністычнай партыяй, натхнёныя непераможным сцягам Леніна — Сталіна, зрабілі вялікі подзвіг, абараніўшы сваю сацыялістычную Бацькаўшчыну, і здабылі гістарычную перамогу над нямецкімі і японскімі імперыялістамі. Вайна паказала, што няма цяпер такой сілы, якая магла-б пераўзыйсці магутнасць совецкага грамадства.

Эканамічная база, створаная за гады пяцігодак, дала нашаму народу магчымасць узяцца ўжо ў ходзе вайны і яшчэ больш грунтоўна адразу ж пасля яе сканчэння за хуткае аднаўленне гаспадаркі і далейшае мірнае будаўніцтва.

Пераход ад вайны да міру высунуў на першае месца пытанні гаспадарчага будаўніцтва, аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі.

Вайна прынесла вялікія разбурэнні і страты нашай краіне. Вядома, што вайна адбілася на эканоміцы нават такіх краін, якія не падвяргліся разрабаванню і спустошэнню варожымі войскамі, такіх краін, якія не адчулі ва ўсёй сіле ваеннага напружання ў першыя гады вайны. Вядома што гэтыя краны, накшталт Англіі і ЗША, разгарнулі найбольш буйныя ваенныя дзеянні толькі пасля свайго ўтаржэння ў Заходнюю Еўропу ў чэрвені 1944 года, з адкрыццём другога фронта ў Еўропе, г. зн. калі стала ясна, што Совецкая Армія зможа без дапамогі саюзнікаў, уласнымі сіламі акупаваць усю Германію і вызваліць народы Еўропы ад нямецка-фашысцкага ярма. Совецкая краіна, якая з першых дзён вайны павінна была напружваць усе свае сілы для адпору ворагу і адчула ўвесь цяжар нямецка-фашысцкага ваеннага нашэсця, асабліва моцна пацярпела ад вайны.

Зразумела, што вынікі цяжкай вайны, разбурэнні многіх раёнаў краіны адчуваюцца цяпер на гаспадарчым становішчы нашай дзяржавы і параджаюць рад цяжкасцяў. Так, моцна дае сябе адчуваць недахоп вугалю і металу, лесу, будаўнічых матэрыялаў і многіх відаў абсталявання. Вайна аслабіла вытворчыя сілы сельскай гаспадаркі. Дадатковыя цяжкасці ў прайшоўшым годзе былі створаны моцнай засухай і неўраджаем на Украіне і ў радзе іншых абласцей СССР, якія зрабілі больш цяжкім харчовае становішча нашай краіны.

Цяпер совецкі народ шырокім фронтам ліквідуе вынікі вайны і разгортвае барацьбу за далейшы ўздым гаспадаркі. Патрыятызм, праяўлены совецкімі людзьмі ў абароне Радзімы, цяпер увасабляецца ў працоўным энтузіязме нашых рабочых, калгаснікаў, совецкай інтэлігенцыі.

Выкананне новага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі, які ўспрыняты совецкім народам як баявая праграма, што глыбока адпавядае яго жыццёвым інтарэсам, яшчэ больш узмоцніць і ўзвялічыць совецкую краіну.

Першы год новай пасляваеннай пяцігодкі адзначыўся вялікімі дасягненнямі ў галіне народнай гаспадаркі. Прамысловасць перабудавалася на выпуск грамадзянскай прадукцыі. Хутка аднаўляюцца раёны, якія падвяргліся нямецкай акупацыі. З пачатку вызвалення ў гэтых раёнах адноўлена 25 доменных печаў, звыш 100 мартэнаўскіх печаў, некалькі дзесяткаў пракатных станаў. Шырока разгарнулася будаўніцтва жылля, асабліва ў раёнах, разбураных ворагам. У параўнанні з 1945 годам прадпрыемствы чорнай металургіі павялічылі ў 1946 годзе вытворчасць чыгуна на 12 проц., сталі — на 9 проц., праката — на 13 проц. Здабыча нафты вырасла на 12 проц., вытворчасць цэмента — на 85 проц. Выпуск трактараў павялічыўся на 72 проц. Вытворчасць грузавых аўтамабіляў узрасла на 38 проц. За прайшоўшы год значна вырасла магутнасць электрастанцый. Тэкстыльная і лёгкая прамысловасць у 1946 годзе далі краіне больш тавараў, чым у 1945 годзе. Выпуск баваўняных тканін павялічыўся на 17 проц., шарсцяных тканін—на 30 проц., шаўковых тканін—на 36 проц., абутку скуранога — на 28 проц. Грамадзянская прадукцыя прамысловасці цалкам вырасла за 1946 год на 20 процантаў. Сярэднесутачная нагрузка на чыгунках узнялася на 13 процантаў.

Партыя і совецкі ўрад прынялі ў прайшоўшым годзе рад важных захадаў па ўмацаванню калгасаў, соўгасаў і МТС. Няспынна клапоцячыся аб умацаванні і развіцці грамадскай гаспадаркі калгасаў і ўзняцці дабрабыту калгаснікаў, партыя і ўрад прынялі захады да таго, каб рашучы спыніць факты раскрадання калгасных земляў і маёмасці калгасаў, якія мелі месца, да ініцыятыўнага захавання Устава сельскагаспадарчай артэлі. Совецкі ўрад аказаў калгасам, якія пацярпелі ад засухі, значную дапамогу харчамі і насеннем.

Таварыш Сталін паставіў задачу—дамагчыся хуткага ўздыму сельскай гаспадаркі, сур'ёзнага павышэння ўраджайнасці і ўстойлівасці ўраджаяў на нашых совецкіх палях. У сувязі з гэтым асабліва важнае значэнне набываюць узмоцненая падрыхтоўка да вясенняй сяўбы і добрае правядзенне яе ў гэтым годзе. Цэнтральны Камітэт партыі, таварыш Сталін патрабуюць, каб усе партыйныя арганізацыі зразумелі аграмадную важнасць гэтай справы і арганізавалі барацьбу за ўздым сельскай гаспадаркі. Ад паспяховага вырашэння гэтай задачы ў значнай ступені залежыць бесперабойнае забеспячэнне прамысловасці сыравінай, рост тавараабароту, павышэнне дабрабыту працоўных. І тым больш неабходнай становіцца цяпер задача палепшыць кіраванне кожным калгасам як буйнай сацыялістычнай гаспадаркай. Таварыш Сталін ставіць перад партыйнымі і совецкімі арганізацыямі задачу забяспечыць калгасы ўзўным мінімумам людзей, «... здольных планіраваць гаспадарку і весці яе арганізавана», падмацаваць нашу вёску значнай колькасцю добрых арганізатараў і палітычных работнікаў. Выкананне гэтай задачы зробіць нашы калгасы яшчэ больш моцнымі.

Важнейшае значэнне набыло ў цяперашні час пытанне аб пашырэнні і ўмацаванні совецкага гандлю, як адным з важных сродкаў для ўзняцця дабрабыту народа. Партыя і ўрад прынялі захады па пасляваеннай перабудове і развіццю тавараабароту. Павялічаны фонды тавараў шырокага спажывання, якія ідуць у гандаль. Праведзены пераходныя мерапрыемствы для зніжэння высокіх камерцыйных цэн з нізкімі пайковымі цэнамі, для стварэння ўмоў да адмены картачнай сістэмы і ўвядзення адзіных цэн. Пастановы ўрада аб разгортванні кааператыўнага гандлю і аб павелічэнні вытворчасці тавараў шырокага спажывання дзяржаўнымі і кааператыўнымі прадпрыемствамі прывядуць ужо ў бліжэйшы час да сур'ёзнага павелічэння масы тавараў шырокага спажывання на рынку.

Скарыстоўваючы перавагі планавай эканомікі, Совецкая дзяржава арганізавана здзейсніла перавод гаспадаркі на шлях мірнага развіцця.

Асабліва вялікая цяпер роля тэмпаў будаўніцтва і вытворчасці, бо іменна з імі цяпер звязана хутчэйшае пераадоленне вынікаў вайны, аднаўленне і развіццё гаспадаркі, палепшэнне матэрыяльных умоў жыцця нашага народа.



Ленін надаваў важнейшае значэнне тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва. Яшчэ калі ў краіне панавала гаспадарчая разруха, Ленін указваў, што «... на месцах трэба імкнуцца няўхільна да таго, каб план выпаўняўся хутчэй, чым ён прызначаны для таго, каб масы бачылі, што той даўгі перыяд, які нас аддзяляе ад поўнага аднаўлення прамысловасці, вопыт можа скарацініць. Гэта залежыць ад нас. Давайце ў кожнай майстэрні, у кожным дэпо, у кожнай галіне паляпшаць гаспадарку, і тады мы тэрмін скародзім» (Творы, т. XXVI, стар. 43). Калі набліжалася да канца грамадзянская вайна, Ленін гаварыў: «Энергія, праяўленая на вайне, павінна быць у такой жа ступені праяўлена і ў галіне працы» (Творы, т. XXV, стар. 21). Дзеля перамогі на фронце працы Ленін заклікаў усіх свядомых прадаўнікоў праяўляць больш упартасці, вытрымкі, настойлівасці, больш арганізатарскага і адміністратарскага майстэрства.

Цяпер, у іншай гістарычнай абстаноўцы, таварыш Сталін ставіць перад совецкім народам пытанне аб паскарэнні тэмпаў аднаўлення і развіцця нашай гаспадаркі, як сродка хутчэйшага пераадолення цяжкасцей пасляваеннага перыяду. Для вырашэння гэтай задачы трэба значна ўзняць тэмпы будаўніцтва і росту вытворчасці ва ўсіх галінах прамысловасці, паскорыць аднаўленне, будаўніцтва і ўвод у эксплаатацыю новых прадпрыемстваў прамысловасці і транспарта, падцягнуць адстаючыя галіны прамысловасці і прадпрыемствы, якія не выконваюць вытворчых планаў, значна ўзняць прадукцыйнасць працы на ўсіх прадпрыемствах.

Вядома, якое велізарнае значэнне ўзняцця прадукцыйнасці працы надаваў Ленін. Таварыш Сталін неаднаразова звяртаў увагу на тое, што ўзняць прадукцыйнасць працы і паскорыць развіццё прамысловасці ў сучасных умовах — значыць раўняцца на перадавых рабочых, на перадавыя заводы, шахты, электрастанцыі, чыгункі, на прадпрыемствы, што працуюць рытмічна, з высокай культурай вытворчасці, якія сістэматычна выконваюць і перавыконваюць свае дзяржаўныя планы. Нашаму сацыялістычнаму грамадству чужы прынцып раўнання на адсталых людзей і адсталую вытворчасць. У цяперашніх умовах, калі совецкай краіне трэба ва ўсіх галінах жыцця хутка рухацца наперад, нашы рабочыя, гаспадарнікі, совецкія і партыйныя работнікі не могуць задавольвацца сярэднімі паказальнікамі вытворчасці. Совецкае грамадства — перадавое грамадства, развіццё каторага ідзе ў паступальным, узыходзячым кірунку. Гэтым рухам павінны быць ахоплены ўвесь рабочы клас, усё сялянства, уся інтэлігенцыя. Гэта азначае, што трэба ўсімі сіламі дамагацца здзяйснення ленінска-сталінскага прынцыпа гаспадарання ва ўмовах совецкай краіны і рашуча падцягваць адстаючыя і тыя, што сярэдне працуюць прадпрыемствы да перадавых, пакончыць з раўнаннем на сярэднія цыфры, на сярэднія рэзультаты ў вытворчасці. Сацыялістычнае спаборніцтва цяпер ператварылася ў краіне, адыграе важнейшую ролю ў выкананні гэтай задачы.

Для таго, каб паспяхова вырашыць паўстаўшыя перад краінай складаныя гаспадарчыя задачы, развіць сапраўдныя большэвіцкія тэмпы, трэба штодзённа выконваць патрабаванне Леніна аб пастаянным паляпшэнні сістэмы кіравання гаспадаркай, павышэнні аператыўнасці і працаздольнасці апарата, аб барацьбе супроць разбухання штатаў, супроць усялякай руціны, коснасці і непаваротлівасці. Нашы совецкія і гаспадарчыя работнікі абавязаны пастаянна памятаць указанні Леніна і Сталіна аб стражэйшым правядзенні эканоміі ва ўсім, аб неабходнасці найбольш рацыянальна скарыстоўваць усе рэсурсы, якія ёсць у краіне, аб барацьбе са стратамі, безгаспадарчасцю і непрадукцыйнымі затратамі, аб строгім правядзенні ў жыццё гаспадарчага разліку, аб неабходнасці паспяхова рыхтаваць, правільна размяркоўваць і скарыстаць кадры ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Наша краіна зноў разгортвае цяпер свае магутныя сілы на фронце мірнай працы. Цяжкая вайна засталася ззаду. Але таму наша партыя і называецца ленінскай, што і пасля вялікай перамогі над ворагам яна вучыць народ не адпачываць на лаўрах, а быць пільным і настарожаным. Бо вядома, што і пасля разгрому нямецка-японскіх імперыялістаў усё яшчэ не сунімаюцца цяперашнія застрэльшчыкі новай вайны, людзі накшталт Чэрчыля і яго сяброў у Англіі і ЗША. Правільна кажуць у нашым народзе, што «черного кобеля не отмоешь до бела». (Агульнае ажыўленне ў залі). Але трэба проста сказаць—сучасная рэакцыя відавочна пераацэньвае свае сілы як на знешне-палітычнай арэне, так і ўнутры капіталістычных краін у барацьбе супроць дэмакратыі і рабочага класа. Не так ужо лёгка цяпер ворагам міру развязаць новую вайну. Народы жадаюць міру і змагаюцца за яго. Правільна, рабочы клас буржуазных краін усё яшчэ недаацэньвае свае сілы ў барацьбе за спразу міру, у барацьбе за свае правы, аднак сілы дэмакратыі і міру намнога пераўзыходзяць сілы рэакцыі і прыхільнікаў вайны. Наш совецкі ўрад, наша партыя, следуючы запаветам Леніна, праводзяць паслядоўную палітыку, накіраваную на арганізацыю трывалага дэмакратычнага міру паміж народамі, на спыненне ўсялякіх спроб імперыялістаў і фашысцкіх паследышаў распаліць полымя нянавісці паміж народамі, пасеяць разлад і варожасць, падрыхтаваць глебу для новай сусветнай вайны. І совецкая краіна можа ганарыцца сваімі поспехамі ў гэтай высокароднай барацьбе за мірнае жыццё народаў, за перамогу дэмакратычных парадкаў і ідэй, можа ганарыцца сваімі дзеячамі, якія па-ленінску працуюць у галіне знешняй палітыкі нашай дзяржавы. (Працяглыя апладысменты).

Таварышы, 23 гады партыя наша ішла наперад пасля смерці Леніна — свайго заснавальніка і выхавацеля, натхнёная яго вялікім сцягам. Дзякуючы правільнай ленінскай палітыцы нашай партыі, совецкая краіна стаіць начале сучасных перадавых прагрэсіўных сіл. Партыя большэвікоў, совецкі народ ганарацца тым, што яны выхаваны найвялікшым генем сучаснай эпохі, што яны змагаюцца пад сцягам Леніна — арганізатара і кіраўніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, заснавальніка будаўніцтва бяскласавага комуністычнага грамадства, волата думкі і рэволюцыйнага дзеяння. Ленінская партыя аказалася вартай свайго заснавальніка і настаўніка. Яна ўспрыняла вучэнне свайго правадыра як баявую праграму. «Так вучыў нас Ленін,— гаварыў таварыш Сталін, — і мы ішлі ў гэтай справе па слядах Леніна».

Няхай-жа і надалей памнажаюцца і растуць сілы сацыялізма на радасць працоўным, на страх іх ворагам! Няхай жыве і мацнее наша вялікая сацыялістычная Бацькаўшчына! (Апладысменты).

II

Жыць і працаваць па Ільічу

Сіла нашай партыі, сіла совецкіх людзей заключаецца ў тым, што яны змагаюцца, працуюць і будуюць сваё жыццё па Ільічу. Таварыш Сталін гаворыць:

«Помніце, любіце, вывучайце Ільіча, нашага настаўніка, нашага правадыра».

«Будуйце новае жыццё, новы быт, новую культуру — па Ільічу».

Ленін лічыў, што для ператварэння комунізма ў практычныя справы, ад людзей—творцаў новага свету запатрабуецца высокая ступень свядомасці і культурнасці.

Ленін надаваў з прычыны гэтага першаступеннае значэнне выхаванню працоўных у духу комуністычнай свядомасці. «Мы на марксісцкай праграме выхавалі партыю пролетарыята, — гаварыў Ленін, — і также трэба выхаваць тыя дзесяткі мільёнаў працоўных, якія ў нас ёсць. (Творы, т. XXIV, стар. 152—153).

Партыя, выконваючы гэты запавет свайго настаўніка, прарабіла велізарную працу па развіццю сацыялістычнай свядомасці совецкіх людзей, па пераадоленню перажыткаў капіталізма ў свядомасці працоўных, па выхаванню ў іх новых якасцей, уласцівых творцам сацыялізма.

Цяпер, калі наша краіна павінна ў найкарацейшы тэрмін пераадолець цяжкасці пасляваеннага часу, здзейсніць задачу завяршэння будаўніцтва сацыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комунізма, асабліва важна ўзняццё сацыялістычнай свядомасці совецкіх людзей. Ленін у гады разбурэння ў гаспадарцы, выкліканым вайной, заклікаў рабочых і сялян працаваць, каб выйсці з цяжкага становішча і гаварыў, што «... мы пачынаем новую бяскроўную барацьбу за гэтую свядомасць» (Творы, т. XXV, стар. 15).

Сацыялізм патрабуе ад сваіх будаўнікоў — рабочых, сялян, інтэлігенцыі ўмення кіраваць дзяржавай, свядома весці гаспадарку. Для гэтага неабходна, каб совецкія рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя мелі яснае разуменне задач, што стаяць перад імі, умелі своечасова ўбачыць у жыцці і падтрымаць новае, сацыялістычнае, распазнаць і перапыніць усё, што цягне назад, перашкаджае ўмацаванню і росту сацыялізма. Комунізм, гаварыў Ленін, павінен зрабіцца даступным рабочым масам, як іх уласная справа.

Наша большэвіцкая партыя арганізуе ўсю работу па комуністычнаму выхаванню народа на падставе ленінскіх ідэй, на падставе ленінізма. Цэнтральны Камітэт нашай партыі прыняў рад важных захадаў да таго, каб палепшыць справу комуністычнага выхавання працоўных, да ўзмацнення палітычнай работы партыйных арганізацый, да пад'ёму ўсёй ідэалагічнай і культурнай работы партыі.

За апошнія годы была выдана вялікая колькасць твораў класікаў марксізма-ленінізма. Даволі сказаць, што за годы совецкай улады было выдана 612.360 тысяч экземпляраў твораў Леніна і Сталіна. Было выдана 37.433 тысячы экземпляраў твораў Маркса і Энгельса. Цэнтральным Камітэтам нашай партыі былі прыняты захады да больш хуткага выпуска ў свет чацвертага выдання Твораў Леніна. Па пастанове Цэнтральнага Камітэта друкуецца першае выданне Твораў таварыша Сталіна. Тры першыя томы ўжо выйшлі ў свет. Па ўказанню Цэнтральнага Камітэта зноў быў выданы тыражом у 10 мільёнаў экземпляраў «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». У творах Леніна і Сталіна абагульнены вопыт барацьбы большэвіцкай партыі за перамогу сацыялістычнай рэволюцыі і будаўніцтва сацыялістычнага грамадства ў нашай краіне, за стварэнне і ўмацаванне Совецкай дзяржавы, далей развіта і ўзбагачана новым вопытам марксісцкая тэорыя. Выданне твораў заснавальнікаў і настаўнікаў нашай партыі адыграе важнейшую ролю ў выхаванні, у ідэйнай загартоўцы нашых кадраў.

Цэнтральны Камітэт партыі і асабіста таварыш Сталін указалі на буйныя хібы, якія мелі месца ў некаторых творах у галіне грамадскіх навук, літаратуры, мастацтва. Прынятыя партыяй меры да ліквідацыі безыдэйнасці, апалітычнасці, якія праявіліся ў радзе твораў літаратуры, мастацтва, навукі, да спынення недапушчальнага лібералізма ў дачыненні чужых большэвізму поглядаў знайшлі гарачую падтрымку ў самых шырокіх колах нашых кадраў, інтэлігенцыі. У выніку гэтых захадаў у нашай краіне адбываецца новы ўздым культуры і мастацтва, узмацняецца ідэалагічная, партыйна-палітычная і прапагандысцкая работа партыйных арганізацый, уздымаецца на больш высокую ступень уся справа выхавання кадраў у духу баявых большэвіцкіх традыцый, у духу ленінізма. Трэба думаць, што гэта выкліча таксама ўздым дзейнасці нашых інстытутаў і ўсіх вучоных, якія працуюць у галіне грамадскіх навук — гісторыі, права, эканомікі, філасофіі, міжнародных адносін.

Партыя ўжыла важныя захады для ўзмацнення ўсёй палітыка-выхаваўчай і культурнай работы сярод працоўных. У сваёй выхаваўчай рабоце партыя кіруецца ўказаннем таварыша Сталіна аб тым, каб совецкія людзі мелі перад сабой вялікі вобраз вялікага Леніна і працавалі па Леніну.

Працаваць па Леніну — значыць самааддана любіць совецкую Радзіму, сваю сацыялістычную Бацькаўшчыну, свой народ, быць палымяным совецкім патрыётам, з кіпучай энергіяй працаваць на карысць Радзімы, быць гатовым да абароны яе ад ворагаў, быць бясстрашным у баю і няшчадным да ворагаў народа. Гэта азначае таксама берагчы, абараняць і ўмацоўваць абвешчаную Леніным палітыку брацтва і дружбы паміж народамі Совецкага Саюза і ўсяляк умацоўваць гэтую дружбу.

Быць падобным Леніну і наследаваць яму ва ўсім—значыць быць смелым наватарам у будаўніцтве сацыялістычнага жыцця, чалавекам, свабодным ад кансерватызма, руціны і коснасці, не паддавацца паніцы пры цяжкасцях, смела ісці наперад і весці за сабой другіх, творча падыходзіць да вырашэння пытанняў. Ленін выхоўваў у совецкіх людзях напорыстасць у дасягненні мэты, рэволюцыйную рашучасць перамагчы цяжкасці. Таварыш Сталін гаворыць, што большэвікі павінны ўмець спалучаць у сабе «магутнае рэволюцыйнае парыванне з настойлівай дзелавітасцю большэвіцкіх будаўнікоў».

Быць падобным Леніну гэта азначае быць бадзёрым у жыцці і ў барацьбе за росквіт сацыялізма, быць праўдзівым і сумленным, глядзець наперад і дасягаць усё новых поспехаў, глыбока верыць у справу нашай партыі, у справу вялікага Леніна. Бадзёрасць, упэўненасць у сваіх сілах, гатоўнасць пераадолець любыя цяжкасці і перашкоды на шляху да комунізма — гэта цудоўныя якасці, якія выхавала партыя большэвікоў у совецкіх людзях.

Хто можа адмаўляць цяпер, што гэтыя выдатныя высакародныя якасці ўласцівы мільёнам і мільёнам совецкіх людзей, якія жывуць і працуюць па Ільічу, што гэта вялікая перамога нашай партыі!

Хто можа адмаўляць цяпер, што ў гэтым яскрава выявілася дасягнутае ў нас маральна-палітычнае адзінства народа, адзінства, якое гэтак глыбока і верна выяўляе стан грамадства ў эпоху сацыялізма!

У выхаванні і сцверджанні новых якасцей у совецкім чалавеку члены ленінскай партыі з асаблівым імпэтам павінны імкнуцца быць вартымі нашага вялікага настаўніка. Члены нашай ленінскай партыі, партыі рэволюцыянераў, павінны ва ўсёй сваёй працы быць на самай перадавой лініі. Большэвік, што працуе на прадпрыемстве, абавязан быць перадавіком, які безумоўна і з лішкам выконвае свой план, перадавіком, на якога можа і павінен раўняцца кожны рабочы. Большэвік, які працуе ў вёсцы, павінен быць актыўным арганізатарам сацыялістычнага жыцця калгаса, умела распаўсюджваць перадавы вопыт калгаснага гаспадарання, барацьбітом умацавання грамадскай гаспадаркі калгасаў і абаронцам інтарэсаў дзяржавы і калгаснікаў. Справа, такім чынам, ідзе аб яшчэ большым узмацненні авангарднай, перадавой ролі комуністаў на вытворчасці і ва ўсім совецкім жыцці. На якім-бы посту ні стаяў большэвік — на прадпрыемстве, у калгасе, ва ўстанове, — ён павінен ажыццяўляць сваю кіруючую ролю як абаронца інтарэсаў дзяржавы, як змагар супроць усялякіх парушэнняў дзяржаўных інтарэсаў і дзяржаўнай дысцыпліны.

Каб належна выконваць абавязкі кіраўнікоў і арганізатараў мас, ажыццяўляць і надалей перадавую і вядучую ролю ў нашым совецкім жыцці, комуністы павінны заўсёды ўдасканальвацца, глыбей і творча авалодваць вялікім ленінскім вучэннем, дасягаць усё большай палітычнай спеласці, убіраць у сябе і ўлічваць у сваёй дзейнасці ўсё новы і новы вопыт сацыялістычнага будаўніцтва. Комуніст абавязаны заўсёды пашыраць свой разумовы кругагляд, імкнуцца быць сёння больш адукаваным і культурным, чым учора, а заўтра—больш, чым сёння. Комуніст абавязаны быць самым баявым і энергічным праваднікам палітыкі нашай ленінскай партыі.

Выхаванне новых сацыялістычных якасцей у совецкіх людзях — гістарычна неабходная справа. Яно ўваходзіць галоўнай часткай у план будаўніцтва комуністычнага грамадства. Яно патрабуе настойлівай працы па разбурэнню ўсялякіх закаранелых забабонаў, застарэлых звычак, рэштак капіталізма, якія тармазяць справу будаўніцтва сацыялізма.

Выхаванне гэтых новых якасцей у совецкіх людзях, няспынны рост іх культурнасці азначае стварэнне разумовай і культурнай перавагі мільёнаў совецкіх людзей над цывілізаванасцю, характарам і ўзроўнем развіцця людзей буржуазных краін.

Так наша большэвіцкая партыя ператварае ў жыццё адзін з важнейшых запаветаў Леніна.

(Канец на 3-й стар.).

Нас натхняе вялікі сцяг Леніна—Сталіна

Даклад тав. Г. Ф. Аляксандрава 21 студзеня 1947 года на ўрачыста-жалобным паседжанні, прысвечаным XXIII-й гадавіне з дня смерці В. І. Леніна

(ПРАЦЯГ)

У гэтай сваёй працы па выхаванню совецкага народа ў духу ленінізма, у духу комуністычнай свядомасці наша партыя мае перад сабой вялікія вобразы сваіх правадыроў — Владзіміра Ільіча Леніна і таварыша Сталіна. Кожны большэвік і беспартыйны працоўны, уважліва вывучаючы, удумваючыся ў гісторыю рэволюцыйнага жыцця, у гісторыю бурлівай дзейнасці выхавальнікаў і правадыроў нашай партыі, бачыць жывы, высокародны прыклад самаадданага служэння народу. У іх біяграфіях, у іх жыцці і дзейнасці ўвасоблены вялікі вопыт нашай партыі, увасоблена марксісцкая навука ў яе развіцці і майстэрскім прыстасаванні да жыцця. У біяграфіях Леніна і Сталіна совецкія людзі бачаць крыніцу мудрасці, крыніцу вялікага палітычнага вопыта партыі, крыніцу пазнання ленінска-сталінскіх ідэй. Зразумела адсюль, чаму ў нашай партыі і ў самых шырокіх колах беспартыйных працоўных нагэтулькі моцна зацікаўленасць да вывучэння біяграфій заснавальнікаў і правадыроў нашай партыі, нагэтулькі яркае і моцнае жаданне чэрпаць з іх жыцця і дзейнасці натхняльны прыклад для далейшых подзвігаў у імя совецкай Бацькаўшчыны.

III

Ленінская партыя—кіруючая і накіроўваючая сіла совецкага грамадства

Стварэнне і выхаванне партыі большэвікоў — вялікая заслуга Леніна.

Наша ленінская партыя ў поўнай меры паказала сябе баявой арганізацыяй работніка класа, палітычным правадыром працоўных, які вядзе за сабой народ на вялікія подзвігі, які ўмее знайсці правільнае вырашэнне самых цяжкіх і складаных надзённых пытанняў жыцця совецкай краіны. Колькі такіх пытанняў паўставала і паўстае ў жыцці нашай Радзімы! І на колькі абдумана, кожны раз узважаючы ўсе плюсы і ўсе мінусы, мудра вырашае іх партыя! Калі цяпер Совецкі Саюз—вялікая сіла сярод краін свету, з якой усім давядзецца лічыцца, дык наш народ абавязаны гэтым палітыцы нашай партыі. Калі Совецкі Саюз разбіў сваіх ворагаў у вайне і цяпер ва ўсю шырыню разгортвае гаспадарчае будаўніцтва, на ўсю моц імкнецца наперад, дык совецкія людзі справядліва звязваюць гэта з дзейнасцю партыі комуністаў, яе мозга і накіроўваючай сілы — ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта. Калі наш народ, сустракаючы на сваім шляху значныя цяжкасці, кожны раз знаходзіць выйсце з іх, умела вырашаючы і ліквідуючы гэтыя цяжкасці, дык гэта аказваецца магчымым толькі дзякуючы выключнай арганізаванасці і дысцыплінаванасці нашай вялікай партыі, дзякуючы кіраўніцтву яе Цэнтральнага Камітэта.

Поспехі палітыкі партыі большэвікоў былі здабыты дзякуючы таму, што партыя няўхільна кіравалася ў сваёй дзейнасці вучэннем Леніна, яго запаветамі. У нашай краіне справядліва называюць ленінізм — сцягам партыі большэвікоў, сцягам мільёнаў працоўных.

Быў час, калі социялісты былі адзіночкамі і не маглі зрабіць колькі-небудзь істотнага ўплыву на ход грамадскага развіцця. Сіла марксісцка-ленінскага вучэння ў тым, што яно, як сказаў таварыш Сталін, ёсць сімвал веры рабочага класа, яго рэволюцыйны сцяг. Сорак год таму назад у сваёй выдатнай працы «Анархізм ці социялізм?» таварыш Сталін пісаў:

«... Маркс і Энгельс з'яўляюцца не проста роданачальнікамі якой-небудзь філасофскай «школы» — яны жывыя правадыры жывога пролетарскага руху, які расце і мацнее з кожным днём. Хто змагаецца супроць гэтага вучэння, хто хоча яго «перагнуць», той павінен добра ўлічыць усё гэта, каб дарэмна не разбіць сабе лоб у няроўным змаганні». (Творы, т. I, стар. 350).

У гісторыі не было прыкладу такой моцнай сувязі партыі са сваім класам, са сваім народам, якую мае партыя большэвікоў. Ленінцы—гэта сапраўдныя змагары за справу рабочага класа, за справу народа. Яны зліваюцца з народам і ідуць наперадзе яго, вядуць яго за сабой, карыстаючыся безмерным даверам і падтрымкай працоўных.

Вялікая, невычэрпная любоў нашага совецкага народа да сваёй роднай партыі, да партыі Леніна—Сталіна. Гэтая любоў і давер працоўных да партыі, зусім выключны аўтарытэт ленінскай партыі ў масах узнікалі і развіліся на працягу многіх год барацьбы партыі за свабоду і шчасце нашага народа. На працягу поўстагоддзя адбывалася гэта гераічная, самаахвярная барацьба партыі, барацьба, якая ўвянчалася сусветна-гістарычнымі поспехамі.

Дваццаць тры гады таму назад таварыш Сталін гаварыў у прамове з прычыны смерці Леніна:

«Дзесяткі і сотні раз спрабавалі працоўныя из працягу стагоддзяў скінуць з плеч прыгнятальнікаў і стаць гаспадарамі свайго становішча. Але кожны раз, разбітыя і зганьбаваныя, вымушаны былі яны адступіць, тоячы ў душы крыўду і звядзагу, злость і адчай і накіроўваючы позіркі на невядомае неба, дзе яны спадзяваліся знайсці збавенне. Ланцугі няволі заставаліся некранутымі, альбо старыя ланцугі замяніліся новымі, такімі-ж цяжкімі і зневажальнымі. Толькі ў нашай краіне ўдалося прыгнечаным і заняволеным масам працоўных скінуць з плеч панаванне памешчыкаў і капіталістаў і паставіць на яго месца панаванне рабочых і сялян. Вы ведаеце, таварышы, і цяпер увесь свет прызнае гэта, што гэтым гігантскім змаганнем кіравалі таварыш Ленін і яго партыя».

У гэтай барацьбе партыі за свабоду і шчасце працоўных, за социялізм—крыніца вялікай любві і поўнага даверу совецкага народа да сваёй ленінска-сталінскай партыі. (Апладысменты).

Сіла ўсенароднага даверу да партыі большэвікоў, сіла маральна-палітычнага адзінства совецкага грамадства ярка выяўляецца ў выбарах цэнтральных і мясцовых органаў совецкай улады. Наш народ з уздымам рыхтуецца да выбараў у Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных рэспублік, на справе ажыццяўляючы прынцыпы совецкай дэмакратыі, дэмакратыі для працоўных. Кожны наглядае цяпер, з якім адзінадушшам падтрымліваюць рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя ўсіх рэспублік вялікага Совецкага Саюза кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў Саюзных і Аўтаномных рэспублік, вылучаных народным блокам комуністаў і беспартыйных. Кожны наглядае, з якой радасцю совецкія людзі вылучаюць кандыдатамі ў дэпутаты сваіх кіраўнікоў — дзеячоў партыі і дзяржавы, свайго выхавальніка і правадыра вялікага Сталіна. (Бурны ўзрыў апладысментаў. Прысутныя стоячы вітаюць таварыша Сталіна). Надыходзячыя выбары Вярхоўных Советаў рэспублік яшчэ больш умацуюць сувязь партыі з працоўнымі, умацуюць нашы Советы і выклічуць далейшы ўздым усёй работы Советаў.

Давер і любоў совецкага народа да ленінскай партыі знаходзяць яркае выяўленне ў росце нашай партыі, якая заўсёды ўбірае ў сябе лепшых людзей рабочага класа як перадавога класа нашага грамадства, сялянства, інтэлігенцыі. Як вядома, партыя страціла ў Айчыннай вайне сотні тысяч сваіх сыноў, якія гераічна змагаліся з ворагам у першых радах совецкіх узброеных сіл і аддалі сваё жыццё за совецкую Бацькаўшчыну. Але разам з тым у партыю безупынна ўступалі ўсё новыя і новыя перадавыя людзі краіны. Яны безупынна ўзмацнялі і падпіралі яе таму, што совецкія людзі лічаць нашу партыю сваёй блізкай і роднай партыяй, дабразахвотна давяраюць ёй свой лёс, яны кроўна зацікаўлены ў пашырэнні і ўмацаванні нашай ленінскай партыі. За гады вайны наша партыя не толькі не зменшылася, але нават памножыла свае рады. Перад вайной у партыі было каля трох з паловай мільёнаў членаў і кандыдатаў, а цяпер у яе радах налічваецца звыш шасці мільёнаў чалавек!

Гэта — вялікая сіла, таварышы! (Апладысменты).

Наша большэвіцкая партыя прадаўжае ўзмацняць і ўмацоўваць свой склад. Асноўны касцяк нашай партыі складаюць цяпер кадравыя рабочыя і перадавыя калгаснікі нашай краіны. У партыю ўцягнены лепшыя людзі совецкай інтэлігенцыі. Цяпер у партыі знаходзяцца больш 400.000 комуністаў, якія маюць вышэйшую асвету, і каля 1.300.000 з сярэдняй асветай, 148.000 інжынераў, 24.000 аграномаў і другіх спецыялістаў сельскай гаспадаркі, амаль 40.000 урачоў, 80.000 педагогаў.

Вялікім дасягненнем нашай партыі з'яўляецца тое, што ў яе складзе больш і мільёна жанчын-комуністак. Гэта азначае, што ў Совецкім Саюзе жанчына, якая мае роўныя правы з мужчынам, прадстаўляе велізарную сілу ў палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці краіны.

Якая яшчэ партыя з кіруючых цяпер партый у буржуазных краінах можа сказаць пра такі-ж яе аўтарытэт у народа, пра давер і любоў да яе самых шырокіх мас працоўных?

Такой партыі няма і не можа быць сярод кіруючых буржуазных і блізкіх ім партый.

Зразумела, што да такой партыі, як партыя большэвікоў, і патрабаванні ставяцца вялікія.

Цэнтральны Камітэт нашай партыі патрабуе яшчэ больш узняць кіруючую баявую ролю нашых партыйных арганізацый ва ўсім совецкім жыцці, узняць актыўнасць партыйных арганізацый у справе аднаўлення і далейшага развіцця нашай прамысловасці, транспарта і сельскай гаспадаркі, узняць увесь наш народ на выкананне і перавыкананне плана 1947 года, другога года новай пяцігодкі.

Таварышы! Вось ужо поўстагоддзя змагаюцца перадавыя людзі нашай краіны пад сцягам ленінізма. Колькі розных палітычных партый узнікла і амаль бясследна прапала за гэты час у многіх буйных сучасных дзяржавах! І толькі наша слаўная партыя стаяла і стаіць усе гэтыя гады, як магутны волат, поўны сіл, бадзёрасці, пільны і мудры, і здзіўляе свет сваімі сапраўды незгасальнымі перамогамі. Ленін называў комуністычную партыю — розумам, гонарам і сумленнем нашай эпохі. Леніну абавязана наша партыя гэтымі выдатнымі якасцямі. Таварыш Сталін гаворыць: «Нас каваў вялікі Ленін, наш правадыр, наш настаўнік, наш бацька, які не ведаў і не прызнаваў страху ў барацьбе». Іменна партыя большэвікоў была той накіроўваючай сілай, якая вяла совецкіх людзей усё наперад і наперад, да вялікай мэты, прадбачліва накрэсленай Леніным,— да комунізма. Пасля смерці вялікага Леніна канчаткова склалася тое кіруючае ядро нашай партыі, якое ў жорсткіх баях з ворагамі партыі абаранілі вялікі сцяг Леніна, аб'яднала і згуртавала ўсю партыю, увесь народ вакол запаветаў Ільіча, вывела совецкі рабочы клас, наша сялянства і інтэлігенцыю на шырокі і правільны шлях будаўніцтва комуністычнага грамадства. Гэтым ядром большэвіцкай партыі з'яўляецца наш Цэнтральны Камітэт, кіраўніком якога і вядучай сілай партыі і дзяржавы быў і ёсць выдатны вучань Леніна, яго варты прыемнік і вялікі прадаўжальнік таварыш Сталін. (Бурныя, працяглыя апладысменты. Усе ўстаюць).

Няхай-жа і надалей жыве і мацнее наша слаўная партыя, створаная і выпеставаная Леніным і Сталіным!

Няхай жыве непераможны сцяг нашай партыі — ленінізм!

Няхай жыве вялікі совецкі народ — творца социялізма!

Няхай жыве вялікі прадаўжальнік справы Леніна—выхавальнік і правадыр совецкага народа, наш родны таварыш Сталін! (Бурныя, доўга не змаўкальныя апладысменты ў чэсць таварыша Сталіна. Усе ўстаюць. Удзельнікі паседжання спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал»).

Кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

★ ★ ★ ★ ★ ★

Кандрат КРАПІВА

Дваццаціпяцігадовая літаратурная дзейнасць Кандрата Кандратавіча Крапівы, якую ён пачаў надрукаваннем у «Чырвонаармейскай праўдзе» фельетона «Жылі-былі», — багатая па зместу і рознастайная па форме.

Барацьбе супроць ворагаў социялістычнай Радзімы, супроць змрочных сіл старога свету, супроць перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей дапамагаў Крапіва сваімі сатырычнымі творамі. Узросшы на вялікіх традыцыях сатырычных пісьменнікаў мінулага — Крылова і Салтыкова-Шчадрына, ён стварае ў беларускай літаратуры совецкую сатыру, якая шчыльна звязана з перадавымі ідэямі сучаснасці і служыць барацьбе за перамогу над знешнімі і ўнутранымі ворагамі, за перамогу новай комуністычнай маралі.

Класавая барацьба на вёсцы, совецкае разумение дружбы, сіла совецкіх людзей і іх чалавечая годнасць, — тэмы, якія хвалююць пісьменніка і знаходзяць высокамастацкае вырашэнне ў яго празаічных творах і п'есах.

Нарадзіўся Крапіва ў 1896 годзе ў в. Нізок, Уздзенскага раёна. Скончыўшы гарадское вучылішча, ён пачынае працаваць настаўнікам. Пасля першай сусветнай вайны і дэмабілізацыі з старой армії ён вяртаецца на педагагічную работу, з якой прызываецца ў Чырвоную Армію. З 1923 года ён зноў працуе настаўнікам, а крыху пазней—інструктарам пры краязнаўчым бюро ў Мінску. У 1931 годзе заканчвае Беларускі Дзяржаўны університэт.

Крапіва прымае ўдзел у вызваленчым паходзе Совецкай Арміі ў Заходнюю Беларусь, затым у вайне з белафінамі. З першых-жа дзён Айчыннай вайны ён змагаецца супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, спачатку як совецкі афіцэр, пасля як рэдактар сатырычнага часопіса «Раздавім фашысцкую гадзіну».

Сваю літаратурную дзейнасць Крапіва пачынае ў 1922 годзе і хутка становіцца вядомым як байкапісец. Бастрыню сваёй сатыры ён накіроўвае супроць рэштак старога, што перашкаджаюць развіццю новага грамадства, новых узаемаадносін паміж людзьмі. Палітычныя байкі яго выхоўвалі пільнасць у совецкіх людзей, у час Айчыннай вайны мабілізавалі іх на барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх злачынцаў.

Сатыра — улюбёны жанр пісьменніка. Асаблівай папулярнасцю ў народзе карыстаецца гнеўная сатыра Крапівы перыяду Айчыннай вайны. Яго сатырычныя творы, надрукаваныя ў цэнтральнай прэсе, у чырвонаармейскіх і партызанскіх газетах, у шматлікіх лістоўках, што перасылаліся за лінію фронта, на часова акупаваную тэрыторыю, былі той зброяй, якая дапамагала знішчаць нямецкіх рабаўнікоў і іх прыслужнікаў—паліцэйскіх і іншых здраднікаў Радзімы.

Разнастайнасць літаратурных форм твораў Крапівы надзвычай вялікая: рыфмаваны лозунг і байка, сатырычная казка і навела, фельетон і жарт, верш і песня, прыказка і прымаўка, раман і п'еса. І ва ўсіх іх выяўляецца выключны талент і майстэрства пісьменніка.

Першая яго п'еса «Канец дружбы», якая была пастаўлена ў тэатры імя Янкі Купалы ў 1933 годзе, выявіла Крапіву як драматурга, які здольны ствараць арыгінальныя персанажы і валодае багатай, сакавітай народнай мовай. Ужо ў гэтай п'есе адчувалася, што мы маем перад сабой майстра глыбока-псіхалагічнай драмы і востра-сатырычнай камедыі. Наступнымі сваімі п'есамі Крапіва сцвердзіў гэта. У п'есе «Канец дружбы» пісьменнік дае разуменне дружбы ў святле новай комуністычнай маралі.

Другой сваёй п'есай «Партызаны» Крапіва канчаткова замацоўвае за сабой вядомасць першакласнага беларускага драматурга. П'еса мела вялікі поспех, прайшла ў многіх тэатрах Беларусі і была паказана ў час дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Вобразы барацьбітоў за маладую совецкую ўладу—партызанскага камандзіра Данілы і посьбіта народнай мудрасці і аптымізма Бадыля—занялі пачэснае месца сярод вобразаў, створаных нашымі драматургамі.

У п'есе «Выпрабаванне агнём», напісанай у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, аўтар паказаў вялікую чалавечую годнасць совецкіх людзей—сілу любві да Радзімы, высокі непахісны дух і веру ў перамогу над моцным і хітрым ворагам.

Камедыя «Хто смяецца апошні», накіраваная супроць людзей з нячыстым сумленнем, раскрыла выдатны талент Крапівы-камедыёграфа.

У галіне мастацкай прозы Крапіва вядомы як аўтар сатырычных навел, што сабраны ў кніжцы «Людзі-суседзі» і рамана «Мядзведзічы».

Пісьменнік заўсёды адгукаецца на хвалюючыя тэмы сучаснасці. Але, вырашаючы надзённыя тэмы, ён накіроўвае позірк у будучыню, яго творы—перспектыўныя.

Крапіва — пісьменнік самабытны, нацыянальны. Ён добра ведае і тонка адчувае народную беларускую мову. У сваю чаргу яго афарызмы сталі здабыткам жывой мовы.

Імя Крапівы шырока вядома не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за межамі яе. Яно было вельмі папулярна і ў Заходняй Беларусі, бо яго творы з гнеўнай сілай білі па тагачаснай панскай рэчаіснасці. Ідэя ўз'яднання беларускага народа ў адной дзяржаве, выяўленая ў творах пісьменніка, знаходзіла жывы водгук у сэрцах працоўных на той бок мяжы.

П'есы Крапівы — «Партызаны» і «Хто смяецца апошні» былі паказаны ў час дэкады беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940 годзе. У гэтым-жа годзе за заслугі ў галіне беларускай літаратуры ўрад узнагароджвае яго ордэнам Леніна.

За п'есу «Хто смяецца апошні» ён атрымлівае гаворовае званне лаўрэата Сталінскай прэміі.

За ахвяры ўдзел у Айчыннай вайне і партызанскім руху Крапіва ўзнагароджаецца ордэнам Чырвонага Сцяга і медалем «Партызану Айчыннай вайны» першай ступені. Ён узнагароджаны таксама медалямі «За перамогу над Германіяй» і «За доблесную працу ў час Айчыннай вайны».

Крапіва з'яўляецца членам-карэспандэнтам Акадэміі навук Беларускай ССР і працуе ў Інстытуце літаратуры і мовы акадэміі. Крапіва—член Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі і адказны рэдактар часопіса «Вожык».

Вылучэнне яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР — высокая ацэнка яго літаратурнай і грамадскай дзейнасці.

Ул. ШАХАВЕЦ.

Анатоль БАГАТЫРОЎ

Уся беларуская музычная грамадскасць з пачуццём глыбокага задавальнення даведалася аб тым, што Анатоль Васільевіч Багатыроў — таленавіты сын беларускага народа—балатыруецца па Чэрвеньскай выбарчай акрузе ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Анатоль Васільевіч з'яўляецца буйным кампазітарам Беларусі. Але А. Багатыроў не толькі творчы работнік. Яго дзейнасць шматгранная і ахоплівае розныя бакі нашага музычнага жыцця. На працягу дзесяці гадоў ён стаіць на чале Саюза кампазітараў Беларусі, накіроўваючы ўсю творчую і грамадскую работу арганізацыі.

Багатыроў заўсёды ўважліва ставіцца да сваіх таварышоў па рабоце, умее ацаніць іх творчыя намаганні, іх запросы і адказаць на іх. Гатовы заўсёды дапамагчы парадай, указаннем, трапным словам,—такім уяўляецца кожнаму, хто сустракаецца з ім па сумеснай рабоце, кампазітар і грамадскі дзеяч А. Багатыроў.

Першыя творчыя вопыты кампазітара адносяцца да гадоў дзяцінства, да перыяду заняткаў у Віцебскай музычнай школе. Пасля наіўных спроб у галіне вакальнай мініятуры кампазітар цалкам аддаецца музычнай дзейнасці.

У 1928 годзе пасля бліскучага выканання фортапіяннага канцэрта Арэнскага на выпускным вечары музычнай школы малады піяніст ва ўзросце 16-ці год пакідае родны горад і паступае на вучобу ў Мінскае музычнае вучылішча па класу фортапіяна і кампазіцыі.

У 1932 годзе Багатыроў адным з першых залічваецца ў Беларускую Дзяржаўную кансерваторыю ў клас праф. В. Залатарова—вучня вялікага рускага кампазітара Рымскага-Корсакава.

Вучоба ў кансерваторыі адыграла пэўную ролю ў фармаванні творчага аблічча кампазітара, у выяўленні яго дараванняў і мастацкіх густаў. Творчы рост маладога кампазітара праходзіў пад знакам глыбокага засваення спадчыны рускай і заходнееўрапейскай музычнай класікі і чулага пранікнення ў сферу народнай рускай і беларускай песні. Гэта дазволіла яму глыбока зразумець сутнасць народнай паэзіі, вобразы блізкай і роднай прыроды, адчуць і засвоіць багаты мелас народнай песні. Ужо ранія творы кампазітара, якія адносяцца да студэнцкіх год (цыкл весень і рамансаў на словы рускіх паэтаў, 1-ая сімфонія і іншыя), прасякнуты народным меласам, светлым і радасным, юнацкім адчуваннем жыцця.

У 1935—36 г. г., у перыяд вучобы ў кансерваторыі, А. Багатыроў пад уплывам моцнага захаплення паэзіяй А. Пушкіна напісаў свежы, глыбока эмацыянальны твор—кантату «Сказ пра мядзведзіху» для хора і сімфанічнага аркестра.

Сакавітая і выразная па свайму музычнаму зместу кантата, якая правільна перадавала інтанацыйную і сюжэтную канву казкі Пушкіна, падкрэсліла вялікі творчы рост і талент кампазітара.

Пасля сканчэння кансерваторыі ў 1937 годзе кампазітар праз два гады прынёс у тэатр оперы і балета партытуру сваёй першай оперы «У пушчах Палесся» па аповесці Якуба Коласа «Дрыгва». Опера з'явілася буйнейшай творчай перамогай кампазітара і выдатнай падзеяй у мастацкім жыцці Беларусі. Народны сюжэт, вобразы роднай прыроды, незвычайная песеннасць музыкі і цеплыня ў характарыстыцы Андрэя, Аўгіні, дзеда Талаша,—усё гэта зрабіла оперу папулярнай і любімай сярод шырокіх народных мас.

У 1941 годзе совецкі ўрад высока ацаніў выдатную работу А. Багатырова ў галіне стварэння беларускай нацыянальнай оперы: кампазітара ўдастоілі званнем Сталінскага лаўрэата.

Пасля дэкады беларускага мастацтва ў Маскве Багатыроў, акрылёны поспехам оперы «У пушчах Палесся» і высокай урадавай узнагародай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, перажывае новы творчы ўздым. Вераломны напад нямецка-фашысцкіх варвараў на нашу краіну вымушае кампазітара пакінуць родны Мінск і эвакуіравацца ў г. Свердлоўск. У час Айчыннай вайны А. Багатыроў стварыў сваю героіка-патрыятычную кантату «Беларускія партызаны», якая ўвасобіла глыбокую нянавісць кампазітара да нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Не менш цікавай па ўвасабленню патрыятычных пачуццяў з'явілася кантата «Ленінградцы», прысвечаная гераічнай абаронцам горада Леніна. Да групы патрыятычных твораў адносіцца яго рамانс «Дарагая мая Беларусь», фортапіянае трыо, опера «Надзежда Дурава», прысвечаная гераічным падзеям Айчыннай вайны 1812 года. На стварэнне гэтага твора кампазітара натхнуў вобраз рускай дзяўчыны Надзежды Дуравай, якая пашла ў армію, каб непасрэдна ўдзельнічаць у барацьбе супроць шматлікіх полчышчаў Напалеона.

Не менш важнай падзеяй восені 1946 г. з'явілася выкананне на адным з творчых вечароў Саюза кампазітараў 2-ой сімфоніі Багатырова. Сімфонія прысвечана дзесятай гадавіне з дня сканчэння кансерваторыі, з дня выхаду на самастойны творчы шлях. Як і ў фортапіянным трыо, у кантаце «Беларускія партызаны», рамансе «Дарагая мая Беларусь» кампазітар і тут звяртаецца да вобразаў Беларусі, да яе прыроды.

Побач з буйнымі манументальнымі творамі кампазітар аддае шмат часу і ўвагі апрацоўцы беларускай народнай песні. Пядаўна кампазітар закончыў санату для скрыпкі і фортапіяна. Беларускі ўрад высока ацаніў заслугі А. В. Багатырова ў справе развіцця беларускай нацыянальнай музычнай культуры і надаў яму годнасць заслужанага дзеяча мастацтва БССР. Багатыроў узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалем «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 г. г.».

Б. СМОЛЬСКІ

У СТУДЫІ „БЕЛАРУСЬ-ФІЛЬМ"

Студыя «Беларусь-фільм» выпускае на экраны два дакументальныя кіно-часопісы. У іх паказаны перадвыбарныя сходы выбаршчыкаў, на якіх беларускі народ назваў першым сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета рэспублікі Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Лаўрэаты Сталінскай прэміі Цытрон, Вейпровіч і другія кіноаператары студыі здымаюць у Мінску, Гомелі і Гродні кінонарысы аб лепшых стаханаўцах, праслаўленых майстрах высокіх ураджаяў, выдатных дзеячах культуры і мастацтва Беларусі, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Рэжысёр Ф. Блажэвіч заканчвае мантаж навукова-папулярнага фільма «Белавежская пушча». У гэтым фільме, які зроблены паводле сцэнарыя пісьменніка В. Вольскага, совецкія гледачы пазнаёмяцца з буйнейшым беларускім запаведнікам, яго жывёльным светам і ласнымі багаццямі.

Закончыліся здымкі поўнаметражнага мастацкага фільма «Новы дом», які расказвае аб пасляваенным жыцці беларускіх калгаснікаў.

На экраны выпускаюцца таксама кінонарысы аб калгасе «Рассвет», дзе старшынёй Герой Совецкага Саюза, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР К. П. Арлоўскі, і аб возеры Нарач, якое называецца «беларускім морам».

У гэтым годзе студыя будзе здымаць вялікі фільм аб гераічных подзвігах беларускіх партызан у гады Айчыннай вайны, сцэнары якога напісалі лаўрэат Сталінскай прэміі Кандрат Крапіва і пісьменнік Міхась Лынькоў. (БЕЛТА).

Выступленне пісьменнікаў

17-га студзеня ў памяшканні Мінскага педагагічнага вучылішча адбылася сустрэча пісьменнікаў з выбаршчыкамі.

Даклад «Беларуская літаратура напярэдадні выбараў» зрабіў Алесь Зарыцкі. Паэты А. Вялюгін і А. Платнер прачыталі свае новыя вершы, прысвечаныя, выбарам у Вярхоўны Совет БССР. Празаік Іван Грамовіч прачытаў нарыс аб кандыдаце ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР настаўніцы В. Захаранік.

Мастацкая самадзейнасць да выбараў

Гомельскім культасветаддзелам Аблвыканкома для абслугоўвання выбаршчыкаў у час выбараў у Вярхоўны Совет БССР створана некалькі канцэртных агітбрыгад.

У склад агітбрыгад увайшоў вядомы народны хор пад кіраўніцтвам Таццяны Лапацінай, канцэртная брыгада Рэчыцкага Дома соцкультуры, калектыў мастацкай самадзейнасці Гомельскага клуба чыгуначнікаў імя Леніна.

Разам з гэтымі брыгадамі ў раёны выязджаюць лектары-прапагандысты, якія перад пачаткам кожнага канцэрта прачытаюць цыкл лекцый аб Сталінскай Канстытуцыі, пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі і міжнародным становішчы.

Кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

* * *

Мікалай САДКОВІЧ

Мікалай Фёдаравіч Садковіч нарадзіўся ў 1908 годзе ў сям'і беднага селяніна ў вёсцы Андрэеўшчына, на Аршаншчыне Бацька яго—парабак, працаваў у маёнтку Усц'е, Аршанскага раёна.

Совецкая ўлада прынесла Фёдар

Садковічу збаўленне ад цяжкага лёсу парабка, ад штодзённых клопатаў аб кавалку хлеба. Дзеці яго атрымалі магчымасць вучыцца.

Жыццерадасны і жвавы хлопчык—Мікола Садковіч прагна накідваецца на кнігі. У хуткім часе ён заканчвае школу, а затым за адзін год—два курсы педагагічнага тэхнікума. У гэты час Мікола Садковіч паступае ў комсамол.

Спачатку юнак марыў стаць настаўнікам, але, удзельнічаючы ў мастацкай самадзейнасці, ён захапіўся мастацтвам і знайшоў у ім сваё прызванне.

У 1925 годзе па пуцёўцы райкома комсамола Садковіч паехаў у Маскву і паступіў на вучобу ў Інстытут кінематаграфіі. Закончыўшы рэжысёрскае аддзяленне і атрымаўшы годнасць кінорэжысёра, ён разгортвае плённую працу ў кіно-студыях Масквы, Кіева, Адэсы і ў Беларусі. М. Садковіч ставіць рад мастацкіх кіно-фільмаў. Найбольш вядомыя з гэтых фільмаў: «Песня пра першую дзяўчыну», «Паводка», музычная камедыя «Шумі, гарадок», «Тры танкісты» і каляровая кіно-карціна «Майская ноч».

Ім-жа быў напісаны рад сцэнарыяў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны М. Садковіч кіраваў здымачнымі франтавымі кіногрупамі. У гэтыя баявыя дні яго можна было часта бачыць на перадавой—у акопах, у зямлянках, у падраздзяленнях. Многія эпізоды з баявых дзеянняў Совецкай Арміі, увекавечаныя на кіно-плёнцы, паслужылі матэрыялам для стварэння кіно-зборніку і дакументальнага фільма «Вызваленне Совецкай Беларусі».

Кожная паездка на фронт давала найбагатшыя факты. М. Садковіч піша і друкуе рад мастацкіх нарысаў, поўных гневу і нянавісці да ворага і палымянай любві да социялістычнай Радзімы, совецкага народа і большэвіцкай партыі. Так з'явіліся ў газетах і часопісах яго артыкулы і нарысы пра Палескі лагер смерці—«Няхай азорыць іх задасць», «Нескароны Мінск», «Дот на баёце» і іншыя. Усе яны прасякнуты гордасцю за непакорны беларускі народ, поўныя непахіснай веры ў перамогу над ворагам.

М. Садковіч даўно сумяшчае сваю работу ў кіно з літаратурнай дзейнасцю. Ім у суаўтарстве з Е. Львовым напісана кніга пра беларускага асветніка Георгія Скарыну. Першая частка гэтай кнігі ў 1946 годзе выйшла ў свет. Яна карыстаецца поспехам у нашага чытача. Думку аб напісанні гэтай кнігі падаў аўтарам Старшыня Совета Міністраў Беларускай ССР і Сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Панамарэнка П. К., які прадставіў ім багаты фактычны матэрыял, абудзіў цікавасць да гераічнага мінулага беларускага народа.

Нямецкія захопнікі поўнасцю разрабавалі, вывезлі з нашай рэспублікі кіно-абсталяванне. У мэтах хутчэйшага аднаўлення яго і далейшага развіцця кіно-мастацтва ў 1946 годзе ў рэспубліцы ствараецца Міністэрства кінематаграфіі. Патрэбны быў даведчаны і вопытны кіраўнік. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР на пасаду Міністра прызначаецца Мікалай Фёдаравіч Садковіч.

З часу ўтварэння Міністэрства справа аднаўлення і развіцця кінематаграфіі значна рушыла наперад. Упарадкавана і павялічана кіно-сетка, палепшана работа кіно-тэатраў. Значным дасягненнем трэба лічыць аднаўленне і пабудову сельскіх кіно-тэатраў метадам народнай будоўлі. Вялікую ўвагу гэтаму мерапрыемству аддае М. Садковіч. Пабудавана ўжо больш за 40 кіно-тэатраў. У Міністэрстве можна бачыць праекты новых цудоўных будынкаў кіно-тэатраў, частка з якіх ужо будуецца ў абласных і раённых гарадах рэспублікі.

Створана, пакуль што невялікая, беларуская кіно-студыя, якая напружана працуе над новымі фільмамі. У яе цэхах і лабараторыях праводзяцца ўжо здымкі фільмаў пра Совецкую Беларусь, пра яе народ, багацці і цудоўную прыроду. Хутка наш глядач убачыць на экране поўнаметражную музычную камедыю «Новы дом», якая адлюструе гераічную працу беларускіх калгаснікаў, мастацкія кіно-нарысы «Рассвет», «Песня пра возера Нарач», «Белавежская пушча», «Народныя таленты» і інш.

Набліжаецца да канца праектаванне вялікай кіно-студыі ў Мінску, якая будзе абсталявана навейшай тэхнікай. Студыя пачне выпускаць вялікія мастацкія фільмы, сярод якіх будуць і каляровыя.

За сумленную і плённую працу ў галіне беларускага мастацтва Мікалаю Фёдаравічу Садковічу нададзена годнасць заслужанага дзеяча мастацтва рэспублікі.

Працоўныя Дзяржынскай выбарчай акругі № 245, Магілеўскай вобласці, адзінадушна вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР Садковіча Мікалая Фёдаравіча. Няма сумнення, што М. Садковіч з гонарам апраўдае давер сваіх выбаршчыкаў.

Н. ГОРЦАЎ,
Л. САДОЎСКІ.

* * *

Павел ЛЮТАРОВІЧ

Павел Вікенцевіч Лютаровіч нарадзіўся ў 1907 годзе ў невялікім мястэчку Гарадное, на Палессі, у сям'і вясковага фельчара. У час імперыялістычнай вайны ўся сям'я, уцякаючы ад нямецкай навалы, перасялілася ў горад Веліж, Смаленскай вобласці, дзе ў 1924 годзе Павел Вікенцевіч скончыў сярэднюю школу.

Пасля сканчэння ў 1929 годзе гістарычнага факультэта Беларускага Дзяржаўнага універсітэта Лютаровіч пачынае працаваць педагогам і аддае гэтай рабоце чатырнаццаць год свайго жыцця. У гэты-ж час у перыядычным друку ён змяшчае рад навукова-папулярных артыкулаў па гісторыі Беларусі. У 1940 годзе партыйная арганізацыя Віцебскага педінстытута прыняла Паўла Вікенцевіча ў члены ВКП(б). З пачатку 1941 года ён—штатны лектар Віцебскага гаркома КП(б)Б.

У красавіку 1943 года Лютаровіч быў выкліканы ЦК КП(б)Б з Сталінградскай вобласці, дзе ён працаваў дырэктарам дзіцячага дома, у Маскву і быў прызначаны загадчыкам навучальнай часткі курсаў па падрыхтоўцы партыйна-совецкіх работнікаў пры ЦК КП(б)Б. З кастрычніка 1943 г. ён працуе штатным лектарам, а з 1945 г.—кіраўніком лектарскай групы пры ЦК КП(б)Б. Лектары гэтай групы ішлі ўслед за наступаючымі совецкімі войскамі.

— У Асіпавічах, Рудзенску і іншых гарадах мы выступалі перад совецкімі грамадзянамі ўжо на другі дзень пасля іх вызвалення, — расказвае тав.Лютаровіч.— Народ прагнуў праўдзівага слова. І лектары на шматлікіх мітынгах, якія часта ўзнікалі стыхійна, адказвалі на ўсе хвалюючыя пытанні.

З ліпеня 1945 года тав Лютаровіч кіруе Камітэтам па справах культасветных устаноў пры Совеце Міністраў БССР.

У красавіку 1946 г Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Павел Вікенцевіч Лютаровіч прызначаецца начальнікам Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР.

У жніўні мінулага года наша рэспубліка пасылае Лютаровіча ў складзе дэлегацыі на Парыжскую Мірную канферэнцыю. Пачалася напружаная адказная работа. Павел Вікенцевіч прадстаўляў БССР у камісіі па палітычных і тэрытарыяльных пытаннях для Венгрыі.

Шмат выступаў Лютаровіч і ў абарону інтарэсаў славянскіх народаў. Ён прысутнічаў на 2-м кангрэсе эмігрантаў—беларусаў і украінцаў.

— Яшчэ будучы лектарам ЦК КП(б)Б, я аб'ездзіў амаль усю Беларусь,—расказвае ён,—але ніколі не думаў, што гэта мне спатрэбіцца за мяжой. Аднак, спатрэбілася. На кангрэсе эмігрантаў кожны з беларусаў жадаў дакладна ведаць, на колькі прадантаў разбураны Лунінец, ці захавалася тое або іншае мястэчка дзе-небудзь на Палессі, як ідзе адбудова прамысловасці ў Гродні, як жывуць калгаснікі на Магілеўшчыне і г. д.

Лютаровіч прыехаў з Парыжа ў той час, калі работнікі мастацтва пачалі перабудоўваць сваю работу ў сувязі з апошнімі пастановамі ЦК ВКП(б) аб ідэалагічнай рабоце. Ён адразу-ж актыўна ўключаецца ў гэту перабудову. Пад яго кіраўніцтвам рэпертуар тэатраў нашай рэспублікі пачаў ачышчацца ад спектакляў, якія не дапамагаюць выхоўваць совецкага чалавека ў духу адданасці сваёй вялікай Радзіме, адданасці справе Леніна—Сталіна. Быў перагледжаны таксама рэпертуар эстрады і мастацкай самадзейнасці. Работнікі мастацтва Беларусі пачалі працаваць над новымі творамі—творамі, якія адлюстроўваюць гераічную барацьбу нашага народа і яго не менш гераічную працу. Сорак два беларускія мастакі ствараюць буйныя палотны на сучасныя тэмы. Новыя совецкія спектаклі, такія як «За тых, хто ў моры», «Далёка ад Сталінграда», «Старыя сябры» і іншыя з поспехам ідуць у нашых тэатрах. Мастацкая самадзейнасць Беларусі атрымала высокую ацэнку на Усесаюзным агляндзе ў Маскве

— Нам яшчэ цяжка працаваць,—адзначае тав. Лютаровіч. — Нашы тэатры не маюць прыстасаваных памяшканняў. Нашы мастакі пакуль што крыху абмежаваны ў сваіх магчымасцях з-за недахопу майстэрняў. Але мы праводзім вялікую аднаўленчую работу. Ужо адбудаваны памяшканні Бабруйскага абласнога тэатра і Маладзечанскага Дома народнай творчасці. Капітальна адрамантаваны будынак Баранавіцкага тэатра. У гэтым годзе будзе скончана аднаўленне будынка тэатра оперы і балета, пачнецца адбудова Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра ў Мінску і Беларускага Дзяржаўнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску.

Як і раней, Лютаровіч часта выступае з дакладамі перад насельніцтвам, актыўна ўдзельнічае ў палітычных кампаніях, якія праводзяцца ў рэспубліцы. Яму ўласцівы настойлівасць і спакой. Усе, каму даводзілася з ім працаваць, падкрэсліваюць яго чулыя і ўважлівыя адносіны да людзей. Гэта было ўласціва Лютаровічу-педагогу, гэта характэрна і для Лютаровіча дзяржаўнага дзеяча.

Выбаршчыкі Плотніцкай выбарчай акругі № 317, Пінскай вобласці, вылучылі свайго земляка, вернага сына большэвіцкай партыі Паўла Вікенцевіча Лютаровіча кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Няма сумнення, што ён з чэсцю апраўдае гэты вялікі давер.

Ул. НІХАМКІН.

Міхаіл КЕРЗІН

Член Аргкамітэта Саюза совецкіх мастакоў СССР, член Праўлення і намеснік старшыні Саюза совецкіх мастакоў БССР Міхаіл Аркадзевіч Керзін з'яўляецца старэйшым скульптарам Беларусі. Ён нарадзіўся ў Маскве ў 1883 годзе ў сям'і музычнага дзеяча. З 1903 года па 1912 год М. А. Керзін вучыўся ў пецярбургскай Акадэміі Мастацтва, у майстэрні Г. Р. Залемана. Дыпломная работа «Вакхічная група» атрымала ўхвалу прафесуры і выдатных рускіх мастакоў. Яшчэ ў Акадэміі М. А. Керзін экспаніраваў на выстаўках свае творы. У 1909 годзе з'явілася яго скульптурная група «Танцуючыя дзеці», у 1910 годзе—«Рэпка». Апошняя работа ўяўляе складаную групу і вызначаецца свабоднай кампазіцыяй і спеласцю задумы. У 1913 і 1914 г. г. скульптар знаходзіўся за мяжой. Ён жыў у Парыжы, наведаў Берлін, Лондан, Стакгольм і Осла. Керзін асабліва ўважліва вывучаў рэльеф і медальёрнае мастацтва, што дапамагло яму працаваць над стварэннем медаляў, у тым ліку над медалем Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя застала М. А. Керзіна ў Ленінградзе. Тут у 1919 годзе пачынаецца яго педагагічная дзейнасць.

З 1920 па 1923 г. ён выкладае ў мастацка-керамічнай школе (г. Веліж), а ў 1923 годзе пераязджае ў Віцебск, дзе становіцца адным з кіраўнікоў Віцебскага мастацкага тэхнікума. Акрамя скульптуры ён

выкладае пластычную анатомію, малюнак і гісторыю мастацтва. У жыцці Віцебскага мастацкага тэхнікума М. А. Керзін адыграў важную ролю. Ён рашуча выступіў супроць фармалістычных тэндэнцый, якія праводзіліся асобнымі выкладчыкамі. Сваіх вучняў ён выхоўваў у духу рэалізма.

Народны мастак БССР, лаўрэат Сталінскай прэміі З. І. Азгур, заслужаныя дзеячы мастацтва А. А. Бембель і А. К. Глебаў і іншыя з'яўляюцца вучнямі М. А. Керзіна.

У 1929 годзе М. А. Керзін пераехаў у Мінск. Тут ён праводзіць вялікую педагагічную работу. Разам са сваімі вучнямі прымае актыўны ўдзел у скульптурным афармленні Дома Урада. Брыгадай, якую ўзначальваў Керзін, былі выкананы манументальныя бюсты Маркса, Энгельса, Бабефа, Дзяржынскага, Фрунзе. Гэтыя бюсты былі ўстаноўлены ў вестыбюлях і на парадным лесвіцы будынка.

У 1936—1938 гадах скульптар працуе над групай для вялікага фантана, фігуры якога ўвасабляюць людзей новай беларускай вёскі.

У 1939 годзе М. А. Керзін атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтва БССР. У 1940 годзе ўрад узнагародзіў яго ордэнам «Знак Пачота». У гэты час Керзін працуе над барэльефам І. В. Сталіна і групай «Юнацтва».

Кожная з работ скульптара адрозніваецца спеласцю задумы і тэхнічнай закончанасцю. Як крытык М. А. Керзін добра валодае мастацтвам аналіза, ён з'яўляецца актыўным змагаром за социялістычны рэалізм у мастацтве.

У артыкуле «Скульптура», надрукаваным у зборніку «Нарысы па гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі», М. А. Керзін падрабязна аналізуе ход развіцця совецкай беларускай пластыкі і расказвае аб яе гісторыі.

У час Вялікай Айчыннай вайны Керзін быў узнагароджаны партызанскім медалем другой ступені і медалем «За перамогу над Германіяй».

Цяпер М. А. Керзін працуе над скульптурнай групай «Вечная слава героям, якія загінулі ў барацьбе за Радзіму». Работа будзе закончана да выстаўкі, прысвечанай 30-годдзю Совецкай улады. Акрамя таго, скульптар завяршае работу над фігурай І. В. Сталіна, піша брашуру пра скульптара З. І. Азгура і «Кіраўніцтва па лепцы» для Дома народнай творчасці.

Работы М. А. Керзіна сведчаць аб высокім артыстызме скульптара, які выдатна валодае майстэрствам. Яго работа па выхаванню кадраў беларускіх скульптараў заслугоўвае самай выдатнай ацэнкі. Ён стварыў рэалістычную школу, выхаваў сапраўдных майстраў.

У гісторыі совецкай беларускай скульптуры М. А. Керзіну належыць пачэснае месца. Працоўныя Чавускай гарадской выбарчай акругі № 260 вылучылі М. А. Керзіна кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Ф. ЛЕЙТМАН.

На партыйным сходзе

У Кіраўніцтве па справах архітэктуры пры Совеце Міністраў БССР адбыўся партыйны сход, які разглядзеў пытанне аб удзеле комуністаў-архітэктараў у падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. З дакладам выступіў сакратар партыйнай арганізацыі І. Станілевіч. Сход зацвердзіў план далейшай агітацыйна-масавай і прапагандысцкай работы калектыва архітэктараў гор. Мінска.

Была адзначана актыўная праца агітатараў Салаўя, Бірулі, Самцова. Архітэктар Я. Маршак і мастак Н. Міхалап афармілі чацверты ўчастак Ленінскай выбарчай акругі. На агітпункце арганізаваны выстаўкі новых архітэктурных праектаў, прачытаны лекцыі для выбаршчыкаў на тэму «Мінск у 1950 годзе» (лектары архітэктар Е. Трахтэнберг і архітэктар У. Кароль).

Новыя кнігі

Выдавецтва «Совецкі пісьменнік» выпусціла ў свет новы зборнік лаўрэата Сталінскай прэміі С. Маршака «Вершы». У зборнік уключаны творы апошніх пяці год.

* * *

У Дзяржаўным выдавецтве мастацкай літаратуры выйшлі з друку аднатомнікі выбраных твораў М. Ю. Лермантава, А. П. Чэхава, зборнікі выбраных вершаў Якуба Коласа, лірычных твораў татарскага паэта Г. Тукая, народны туркменскі раман «Шасенем і Герыб» і кніга Н. Піксанава «Горкі і нацыянальныя літаратуры».

* * *

Да 140-годдзя з дня смерці вялікага рускага архітэктара Ф. Шубіна выйшла з друку манаграфія І. Жыдкова—«Вобраз Шубіна».

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

На апошнім паседжанні Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі 16 студзеня 1947 года быў абмеркаваны артыкул «Аб недахопах у друкаванай прапагандзе і ў літаратуры Беларусі», які змешчаны ў газеце «Культура і жыццё» № 1 (20) ад 11 студзеня 1947 г.

Праўленне прызнала зусім правільнай крытыку недахопаў у беларускай літаратуры і вызначыла рад мерапрыемстваў, накіраваных на ўзняцце ідэйнага ўзроўню беларускай драматургіі. Усе новыя творы будуць шырока абмяркоўвацца на секцыях Саюза пісьменнікаў. Секцыі драматургаў даручана абмеркаваць пераапрацаваную аўтарам п'есу «Заложнікі» і прысвяціць адно з бліжэйшых паседжанняў праблемным пытанням драматургіі.

Праўленне ўказала рэдакцыі газеты «Літаратура і Мастацтва» на тое, што яна не надрукавала крытычных матэрыялаў пра п'есы «Мілы чалавек» і «Заложнікі».

К. Крапіва і А. Кучар у сваіх выступленнях прызналі правільнай крытыку іх п'ес газетай «Культура і жыццё».

Аб удзеле пісьменнікаў ва ўсесаюзным конкурсе на лепшую сучасную совецкую п'есу зрабіў інфармацыю драматург К. Крапіва. Праўленне ўсямерна будзе дапамагаць правядзенню конкурса, прапагандуючы яго праз друк, і будзе садзейнічаць творчай рабоце драматургаў, якія працуюць над п'есамі аб сучаснасці.

Затым была абмеркавана работа яўрэйскай секцыі Саюза совецкіх пісьменнікаў. Даклад зрабіў паэт Х. Мальцінскі.

Да Вялікай Айчыннай вайны секцыя складалася з 26 яўрэйскіх пісьменнікаў. Многія таварышы загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

За апошні час яўрэйскія пісьменнікі праявілі значную творчую актыўнасць. Падрыхтаваны да друку альманах. А. Платнер напісаў кнігу апавяданняў і працуе над паэмай аб удзеле яўрэйскага насельніцтва ў партызанскім руху. Г. Камянецкі працуе над п'есай, З. Цялесін і М. Ліўшыц падрыхтавалі зборнікі вершаў. Яўрэйскія пісьменнікі працуюць над творамі аб Айчыннай вайне і аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі.

У сваіх выступленнях К. Крапіва, Г. Камянецкі, А. Платнер, С. Майхровіч, К. Кірэенка і другія крытыкавалі работу секцыі і падкрэслілі, што яўрэйскім пісьменнікам неабходна больш актыўна ўдзельнічаць у літаратурным жыцці краіны і ў рабоце Саюза пісьменнікаў. Праўленне даручыла Х. Мальцінскаму, Г. Камянецкаму і А. Платнеру выпрацаваць мерапрыемствы, накіраваныя на палепшанне работы секцыі.

Пятрусь Броўка зрабіў інфармацыю аб удзеле Саюза пісьменнікаў Беларусі ў падрыхтоўцы да адзначэння 800-годдзя сталіцы Совецкага Саюза — Масквы. Створана камісія ў складзе П. Броўкі (старшыня), К. Кірэенкі і Р. Няхая, якая збярэ літаратурна-мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў аб Маскве для юбілейнага зборніка. Лепшыя творы будуць змешчаны ў перыядычным друку і юбілейным зборніку, прысвечаным 800-годдзю Масквы.

На гэтым-жа паседжанні быў прыняты ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў малады паэт Паўлюк Пранузa, аўтар кнігі вершаў «Разгневаная зямля».

„ПОЛЫМЯ“ № 10

Выйшаў з друку дзесяты нумар часопіса «Полымя». У ім змешчаны «Даклад тав. Жданава аб часопісах «Звязда» і «Ленінград», пачатак паэмы Якуба Коласа «Рыбакова хата», вершы Пятруся Броўкі «Народнае дзякуй», «Каб мне стаць», Анатоля Вялюгіна «Салют у Мінску», «У дарозе»; апавяданні Івана Мележа «Гарачы жнівень», Юрыя Рудзько «Пасля развітання», Паўла Кавалёва «Мой хлопчык»; артыкулы Алеся Кучара «Новая зямля» Якуба Коласа» і Ганны Базыленка «Вобразы і кампазіцыя паэмы «Адплата» Якуба Коласа».

Мастакі-самавучкі

У г. Гродні працуюць мастакі-самавучкі Б. Балдак і А. Гаманчук. На Абласную выстаўку, якая адкрыецца ў сакавіку, і Усесаюзную выстаўку Балдак рыхтуе партрэт І. В. Сталіна (разьба па дрэву).

А. Гаманчук — скульптар і мастак-пейзажыст. На першай Абласной выстаўцы выяўленчага мастацтва ён атрымаў першую прэмію за карціны «Пасля дажджу» і «Карчма ў Азёрах».

У вёсцы Воранавічы Зяленскага раёна жыве разбяр па дрэву, інвалід Вялікай Айчыннай вайны, І. Саўко. За апошні час ён выканаў работы: партрэт таварыша Сталіна, «Волат» і «Жанчына, якая прадзе».

І. ЛОСЬ.

На тэмы дня

СТВАРЫЦЬ ТВОРЧУЮ АТМАСФЕРУ

7 верасня 1946 г. тэатр імя Янкі Купалы распачаў свой асенне-зімовы сезон. Ужо прайшло пяць месяцаў, а мы не бачым ніводнай новай пастаноўкі. А між тым тэрмін дастатковы для таго, каб выпусціць хаця-б дзве прэм'еры. Старыя пастаноўкі не вабяць больш гледача, і як вынік усяго гэтага — пустая заля. Глядач пачынае паступова адвыкаць ад таго, што ён гэтак любіў і шанаваў. У тэатры стала неяк брудна, няўтульна, усюды пануе страшэнны холад, глядач сядзіць у паліто, акторы на сцэне таксама мерзнуць, і нейкі «халадок» адчуваецца ў іх творчасці.

Пастанова ЦК ВКП(б) аб рэпертуары драматычных тэатраў і мерах па яго паляпшэнню не выконваецца, не гледзячы на тое, што яна была абмеркавана і на партыйным сходзе і на сходзе калектыва тэатра. На сходах былі прыняты канкрэтныя прапановы, накіраваныя на тое, каб рэзка палепшыць работу ўсяго калектыва. Вырашана было неадкладна ўключыць у рэпертуар дзве новыя совецкія п'есы і выпусціць іх да канца 1946 г., умацаваць мастацкае кіраўніцтва, якое фактычна адсутнічае і цяпер, умацаваць адміністрацыйнае кіраўніцтва, якое здолела-б узняць калектыў тэатра на выкананне складаных задач, што паўсталі перад ім. Былі ўключаны ў рэпертуар дзве совецкія п'есы «За тых, хто ў моры» Б. Лаўрэнёва і «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона. Распачалася работа над імі. Але тэмпы, якімі вядзецца работа па выпуску прэм'ер, такія марудныя, што цяпер нават цяжка сказаць, калі выйдуць гэтыя спектаклі. Безумоўна, кіраўніцтва тэатра зрабіла памылку, зацягнуўшы тэрміны выканання афармлення. Новы дырэктар тэатра тав. Маханёк не прыняў належных захадаў для таго, каб як мага хутчэй пусціць у работу гэтае афармленне. Тав. Маханёк, відаць, яшчэ не ўсвядоміў значэння, якое мае для ўсёй нашай грамадскасці своечасовы выпуск прэм'еры спектакля на сучасную тэму, а тая атмасфера поўнага бязладдзя, што пануе цяпер у тэатры і якая гэтак хвалюе калектыў, яго таксама мала турбуе.

Апошні адкрыты партыйны сход досыць выразна выявіў гэта. Усе выступаўшыя таварышы адзначылі, што кіраўніцтва не стварае належных умоў для нармальнай работы калектыва. Перш за ўсё гэта датычыцца дырэктара тав. Маханька.

На работу тэатра адмоўна ўплывае таксама і адсутнасць мастацкага кіраўніка. Мастацкі кіраўнік Г. П. Глебаў фактычна не кіруе творчай работай. Па сутнасці ніхто не адказвае за творчую работу тэатра. Незразумела, чаму Кіраўніцтва па справах мастацтва, добра ведаючы становішча аднаго з старэйшых тэатраў рэспублікі, не зробіць належных арганізацыйных вывадаў.

С. БІРЫЛА,
заслужаны артыст БССР.

У Барысаве патрэбна музычная школа

(Ліст у рэдакцыю)

У горадзе Барысаве да Вялікай Айчыннай вайны існавала музычная школа, філіял якой быў і ў Нова-Барысаве. Работа ў школе праводзілася добра; яна карысталася вялікім аўтарытэтам сярод насельніцтва горада і дзяцей. Тут навучалася некалькі дзесяткаў дзяўчат і хлопчыкаў, якія займаліся з вялікай ахвотай. У горадзе прыкметна пачала пашырацца музычная культура.

Цяпер у г. Барысаве і Нова-Барысаве музычнай школы няма, не гледзячы на тое, што і прадстаўнікі Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР і кіраўнікі аддзела мастацтва пры Мінскім Аблвыканкоме яшчэ ў 1945 г. запэўнялі грамадскасць, што музычная школа ў г. Барысаве будзе адкрыта. Горвыканком нават прыняў спецыяльнае рашэнне аб адкрыцці музычнай школы ў горадзе. Аднак, справа далей пастаноў чамусьці не ідзе.

Улічваючы вялікае жаданне насельніцтва і асабліва моладзі вучыцца музыцы, Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР і Мінскі абласны аддзел мастацтва павінны прыняць усе меры да хутчэйшага адкрыцця музычнай школы ў г. Барысаве.

В. САМЦЭВІЧ,
школьны інспектар Барысаўскага Гарана.

Рэдкалегія: Л. Александроўская, А. Багатыроў, Г. Глебаў, П. Кавалёў, Якуб Колас, А. Куляшоў, А. Кучар (в. а. адказнага рэдактара), П. Пестрак, Г. Таран.

АТ 01721 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Рэволюцыйная, 3 Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэволюцыйная, 12